Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ЛЮТАГА 2015 г. ПЯТНІЦА № 23 (27881) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

З адрэналінам у крыві

СТАР. 5

Не адчыняй, бабуля!

СТАР. 15

ЛІЧБА ДНЯ

$480 млн

павінен скласці аб'ём экспарту турпаслуг у 2015 годзе ў сферы турыстычнага бізнесу. Дарэчы, экспарт турпаслуг за студзень-лістапад 2014 года склаў $236 млн, што на 8,6% больш у параўнанні з аналагічным перыядам 2013 года. Традыцыйна каля 70% у агульным аб'ёме экспарту турыстычных паслуг Беларусі займае Расія. Разам з тым у 2015 годзе намаганні па прасоўванні турыстычных магчымасцяў краіны будуць сканцэнтраваны таксама на рынку Заходняй Еўропы і краінах БРІКС (Бразілія, Расія, Індыя, Кітай, Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка). Ставіцца задача павысіць попыт на турпаслугі з боку грамадзян Турцыі і Ізраіля, паколькі з гэтымі дзяржавамі дасягнуты дамоўленасці пра бязвізавае перамяшчэнне грамадзян.

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 06.02.2015 г.

Долар ЗША	15410,00	▲
Еўра	17500,00	▲
Рас. руб.	225,00	▼
Укр. грыўня	918,36	▼

ISSN 1990 - 763X

КАЛЕГІ-ПЕРАМОЖЦЫ

Фота БЕЛТА.

19-гадовая артыстка Белдзяржцырка Настасся ЯЎХІМЕНКА са сваім нумарам «Хула-хупы на кані» перамагла на міжнародным фестывалі цыркавога мастацтва «Залаты Карл-2015» у Рызе. Прыз глядацкіх сімпатый таксама дастаўся Настассі і яе чатырохногаму калегу.

■ Рынак працы

ПАТРАБУЮЦЦА ЖЫВЁЛАВОДЫ І ПАСПЯХОВЫ БІЗНЕСМЕН-ПЯЧНІК

Каля 70 працэнтаў раённых вакансій — працоўныя месцы ў вёсцы

Беспрацоўныя мінчане, якія скардзяцца на адсутнасць вартых прапаноў, выклікаюць здзіўленне. З 10 тысяч вакансій (менавіта столькі на сёння свабодных працоўных месцаў у сталіцы) можна што-небудзь выбраць, было б жаданне. А ці лёгка знайсці працу ў раёне? Якія заробкі ў вясковых спецыялістаў і чаму моладзі трэба атрымліваць прафесію? Каб даведацца пра гэта, карэспандэнты «Звязды» адправіліся ў недалёкую правінцыю — Пухавіцкі раён Мінскай вобласці.

СТАР. 13



Фота Надзеі БУЖАН.

Спакою і цярпенню галоўнага спецыяліста Людмілы АЗЕРСКАЙ, якая 18 гадоў працуе ў аддзеле занятасці, можна толькі пазайздросціць.

■ Надвор'е

У НЯДЗЕЛЮ — МОЦНЫЯ СНЕГАПАДЫ

А ўначы на аўторак прагназуюцца маразы да мінус 22 градусаў

У пятніцу пры павышаным фоне атмасфернага ціску ў большасці раёнаў ападкаў не будзе. Толькі ў другой палове дня на поўначы пройдзе снег, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад нуля да мінус 5 градусаў. А ў выхадныя надвор'е сапсуецца. Ужо ў суботу атмасферныя франты з боку Балтыйскага мора прынясуць на тэрыторыю Беларусі кароткачасовы снег. У асобных раёнах чакаецца туман і галалёдныя з'явы. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад мінус 1 да мінус 7 градусаў, пры праясненнях — да 8–12 марозу. Удзень ад мінус 3 да плюс 2 градусаў.

Увогуле складаным стане надвор'е ў нядзелю. Часам паўсюдна будзе ісці снег, а ў асобных раёнах прагназуюцца моцныя снегапады. Месцамі завіруха і ўзмацненне ветру, парывамі да 15–18 м/с. Уначы на нядзелю тэмпература будзе ў межах 1–7 марозу, удзень — ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня да нас завітае яшчэ халаднейшае паветра з поўначы Еўропы. Часам будзе ісці снег, слабая мяцеліца, на дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак складзе мінус 5–11 градусаў, пры праясненнях — да мінус 15 градусаў. Удзень — ад 2 да 9 марозу. Тэмпература паветра ўначы на аўторак стане мінус 8–15 градусаў, пры праясненнях магчыма паніжэнне тэмпературы да 16–22 градусаў. Удзень чакаецца 1–8 марозу.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Медыяпрастора

ДОБРАЯ ДЫНАМІКА РАЗВІЦЦЯ

Калегія Міністэрства інфармацыі прааналізавала працу ведамства за мінулы год і вызначылася з задачамі на цяперашні

Асаблівая ўвага была нададзена прававой культуры масмедыя, працы ў інтэрнэце, эканамічнай эфектыўнасці сферы СМІ.

— Сродкі масавай інфармацыі адыгрываюць вельмі істотную ролю ў жыцці грамадства, — зазначыла **намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА,** якая прысутнічала на калегіі. — Яны ў большай ступені фарміруюць думку грамадзян нашай краіны, таму ад праўдзівай працы сродкаў масавай інфармацыі, ад прафесіяналізму работнікаў гэтай сферы залежыць вельмі многае. Лічу, што нашы СМІ працуюць дастаткова паспяхова. Разам з тым часам з'яўляюцца публікацыі, сюжэты, інфармацыя ў якіх уяўляецца недастаткова вывучанай. Важна, каб прадстаўнікі СМІ больш уважліва вывучалі інфармацыю хаця б на ўзроўні тых рэгіёнаў, адкуль яна прыйшла.

Фота БЕЛТА.

Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ звярнула ўвагу ў цэлым на работу СМІ ў мінулым годзе.

— Падводзячы вынікі 2014 года, мы праводзім сур'ёзны аналіз работы не толькі СМІ, але і ў цэлым галіны друку — сёння гэта і паліграфічныя прадпрыемствы, і выдавецтвы. У нас ёсць добрая дынаміка развіцця, добрыя лічбы, мы выканалі ўсе паказчыкі. Калі казаць аб працы нацыянальных сродкаў масавай інфармацыі, то мы бачым добрую дынаміку па нацыянальных тэлеканалах, перыядычных выданнях. Мы працавалі ў знакавы год 70-годдзя вызвалення Беларусі, таксама знакавымі былі тэмы спорту, Алімпіяды, тэмы, звязаныя з Годам гасціннасці. Мы паказалі, што можам вельмі эфектыўна асвятляць сацыяльна значныя падзеі, паказваць, як жыве беларускі народ, не толькі для сябе, але і ўсяму свету.

Лілія Ананіч заўважыла, што летась прырос эфір спадарожнікавага тэлеканала «Беларусь 24»: яго сёння маюць магчымаць глядзець нават за Уралам.

— У мінулым годзе мы зрабілі сур'ёзны акцэнт на прававым полі. Прыняты Закон «Аб сродках масавай інфармацыі», які ў поўнай ступені прымяняе меры адказнасці да прадукцыі СМІ, што размяшчаецца на інтэрнэт-рэсурсах. Гэта праца па кантролі, аналізе інтэрнэт-кантэнту вядзецца. Павінна быць і прававая культура, і адказнасць уладальнікаў.

Асаблівую ўвагу Лілія Ананіч надала планам работы ведамства на бягучы год.

— Улічваючы ўзрастальную ролю інтэрнэту як крыніцы інфармацыі, міністэрства надае значную ўвагу дзейнасці ў гэтым сегменце. Вяшчанне ў анлайн-рэжыме вядуць рэспубліканскія тэлеканалы, практычна ўсе маюць унікальны інтэрнэт-кантэнт і ажыццяўляюць інтэрнэт-трансляцыю. Мы ведаем, што дастаткова папулярныя праграмы маюць вялікую глядацкую аўдыторыю. Трэба адзначыць, напрыклад, афіцыйны канал АНТ на YouTube, які на сёння з'яўляецца самым праглядальным беларускім акаўнтам на гэтым відэахостынгу: ён набраў больш за 26 мільёнаў праглядаў па сітуацыі на першага студзеня гэтага года.

Міністр інфармацыі таксама заўважыла, што летась актыўна развіваўся партал газеты «СБ. Беларусь сегодня».

— Выдавецкі дом «Звязда» стварыў акаўнты ў сацыяльных сетках, — заўважыла Лілія Ананіч. — Таксама ёсць вельмі цікавы праект групы «Беларуская культура: літаратура, мастацтва і гісторыя» ў сацыяльнай сетцы «Фэйсбук», на новай тэхналагічнай аснове рэалізаваны праект «Адкрый Беларусь».

Закранаючы тэму аптымізацыі сістэмы дзяржаўных СМІ краіны, што атрымліваюць падтрымку з рэспубліканскага бюджэту, міністр адзначыла, што ў 2014 годзе часопіс «Алеся» быў далучаны да Выдавецкага дома «Звязда», «Народная газета» пачала выпускацца ў медыйным аб'яднанні «Советская Белоруссия» ў новым фармаце.

— Вынікам аптымізацыі структуры рэспубліканскіх СМІ стала эканоміка: «Советская Белоруссия» атрымала значны прыбытак, і мы сэканомілі значныя бюджэтныя сродкі, — паведаміла кіраўнік інфармацыйнага ведамства.

Кажучы пра кадравую палітыку ў сферы СМІ, Лілія Ананіч нагадала, што кіраўніком краіны быў прыняты і з першага студзеня ўступіў у сілу Дэкрэт № 5.

— Дысцыпліна і адказнасць, эфектыўная работа прадпрыемства, уменне арганізаваць працу — усё гэта ляжыць на кіраўніку. Крытэрыем стаўлення да кожнага з нас з'яўляецца наш прафесіяналізм і адказнасць, дзяржаўнае стаўленне да даручанай справы.

Досыць стратэгічным і праграмным стала выступленне на калегіі **намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігара БУЗОЎСКАГА.** Акцэнтаваўшы ўвагу на асаблівасцях 2015 года ў грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці краіны, ён звярнуў увагу на высокую адказнасць СМІ, журналістаў розных медыйных рэсурсаў за выказанае слова, праўдзівасць у адлюстраванні рэчаіснасці.

Як адзначыў Ігар Бузоўскі, Міністэрству інфармацыі, а таксама іншым ведамствам неабходна каардынаваць свае дзеянні для забеспячэння інфармацыяй грамадзян краіны ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Беларусі, дзеючымі законамі.

Сёння грамадзяне Беларусі дэманструюць высокую сацыяльную актыўнасць, што пацвярджае актуальнасць тэмы інфармацыйнага забеспячэння. Ігар Бузоўскі адзначыў, што сацыяльная актыўнасць грамадства будзе ўзрастаць, а гэта прадугледжвае шчыльнае супрацоўніцтва сродкаў масавай інфармацыі, усіх дзяржаўных структур у давядзенні інфармацыі да шырокіх слаёў насельніцтва.

Вельмі важна ўкараняць сучасныя тэхналогіі ў сферы СМІ, але гэтак жа важна, каб пры гэтым не было такіх сітуацый, калі па нейкай прычыне новаўвядзенні не ахапілі ўсіх грамадзян краіны. Гаворачы аб пераходзе на лічбавае тэлевізійнае вяшчанне, адмове ад праваднога радыё, Ігар Бузоўскі падкрэсліў неабходнасць суладнай і ўзгодненай працы структур не толькі Міністэрства інфармацыі, але і іншых, што дазволіць своечасова і належным чынам перайсці на новыя тэхналогіі ў інфармацыйнай сферы без страт: «Гэта не вузкаведамасная задача, трэба скаардынаваць гэтую працу і правесці аналіз у бліжэйшы час. Калі мы бязбольна пяройдзем на лічбу, не паўстане пытанняў у атрыманні інфармацыі кожным грамадзянінам Беларусі».

Ён таксама адзначыў, што важным складнікам дзейнасці СМІ з'яўляецца інфармацыйная бяспека.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

■ Блізкая ўлада

Па ўсіх зваротах — канкрэтныя даручэнні

Па ўсіх зваротах, што паступілі па тэлефоне на «прамую лінію» да старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Краўцова і яго намеснікаў, дадзены канкрэтныя даручэнні, якія знаходзяцца на кантролі.

Паводле інфармацыі з аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб аблвыканкама, падчас трох «прамых ліній» кіраўнікі адказалі на 100 пытанняў. Больш за ўсё званкоў тычылася жыллёва-камунальнай гаспадаркі (дарожнае будаўніцтва, рамонт дамоў, добраўпарадкаванне прыдамавых тэрыторый, утрыманне вуліц у зімовы перыяд, выразанне аварыйных дрэў). Таксама ўзніміліся пытанні асвятлення вуліц у вёсках, газіфікацыі і іншыя.

У прыватнасці, пасля звароту на «прамую лінію» Лідскі райвыканкам прыняў меры па пашырэнні асартыменту мясной прадукцыі ў краме аграгарадка Ёдкі. Пры гэтым Траццякоўскі сельвыканкам шляхам анкетнага апытання пацікавіўся меркаваннямі на гэты конт мясцовых жыхароў.

Зразумела, што зварот на «прамую лінію» не азначае, што тая ці іншая праблема адразу ж вырашыцца. Аднак людзі павінны ведаць, ці магчыма гэта зрабіць. А калі рэальна, то ў які тэрмін. Напрыклад, пасля «прамой лініі» намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Дзяшко ў мясцовых газетах надрукуюць спісы чарговасці на газіфікацыю населеных пунктаў, рамонт дарог, работ па цеплавой рэабілітацыі жылых будынкаў.

Адзін са званкоў быў ад мінчанкі, якая прыязджае ў Іўеўскі раён і дабіраецца ад цягніка да дачы праз калгаснае поле. Але бывае нязручна, бо сельгаспрадпрыемствам заворваецца сцежка. У райвыканкаме паведамілі, што для зручнасці пешаходаў заворваць яе ў далейшым не будуць. І тут, пры ўсёй павазе да заяўнікаў, узнікае пытанне да іх: няўжо па кожнай праблеме трэба сігналізаваць менавіта «ўверх»? Чаму б спачатку не звярнуцца ў мясцовыя інстанцыі — у дадзеным выпадку, у той жа сельгаскааператыў, сельвыканкам?

Дарэчы, трэба ведаць, што Указам Прэзідэнта Беларусі №498 «Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб» дакладна зацверджаны пералік дзяржаўных арганізацый, якія ўпаўнаважаны разглядаць тыя ці іншыя пытанні па ўсіх сферах жыццядзейнасці — так бы мовіць, знізу даверху. І хіба ж правільна, мінуючы адпаведныя структуры на тэрыторыі сельсавета, раёна, адразу ж звяртацца ў вобласць ці сталіцу? Альбо які сэнс скардзіцца на судовыя рашэнні ў аблвыканкам, што, згодна з заканадаўствам, не ўпаўнаважаны разглядаць такія звароты?

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

■ Гучная справа

Забойца Юліі Саламацінай атрымаў пакаранне

У судзе Фрунзенскага раёна сталіцы паставілі кропку ў гучнай справе.

За забойства і пашкоджанне афіцыйных дакументаў Павел Цыняўскі атрымаў 17 гадоў пазбаўлення волі, а яго маці за ўкрывальніцтва асобы, якая здзейсніла асабліва цяжкае злачынства, шкоду дакументаў, — 2 гады калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Пры гэтым першыя 5 гадоў Цыняўскі павінен будзе правесці ў турме, астатні тэрмін — у калоніі строгага рэжыму. Акрамя таго, асуджаныя павінны пакрыць маральную і матэрыяльную шкоду маці забітай дзяўчыны.

У ліпені 2014 года Юлія прыехала на спатканне з хлопцам, з якім пазнаёмілася ў інтэрнэце. Падчас сваркі Цыняўскі задушыў яе, з дапамогай маці расчляніў цела і пазбавіўся яго. Пасля яны хаваліся ад праваахоўнікаў у лясах, аднак потым напісалі яўку з павіннай.

Якаў ЖУРБІН

■

■ Здарэнне

У водную сістэму трапілі нафтапрадукты

У сталіцы ліквідавалі ўцечку нафтапрадуктаў у Сляпянскую водную сістэму. Мазут трапіў у акваторыю канала ў раёне Нацыянальнай бібліятэкі.

Нафтапрадукты трапілі ў ваду з калектара дыяметрам 800 міліметраў. Работнікі МНС на акваторыі канала ніжэй па цячэнні ўстанавілі дзве бонавыя загароды на адлегласці 20 і 100 метраў, у калодзеж ліўневай каналізацыі вышэй месца ўцечкі — пнеўматычную заглушку. Аварыя была ліквідавана праз 2,5 гадзіны пасля паведамлення пра яе сталічным выратавальнікам. Рэчывам, якое трапіла ў водную сістэму, аказаўся сінтэтычны матэрыял, які выкарыстоўваецца ў будаўніцтве ў якасці гідраізаляцыі. Работнікі Мінскага камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя адабралі пробы вады з акваторыі канала для аналізу на забруджванне нафтапрадуктамі. Па вынікаў перавышэнне нормы склала больш чым 23 разы. Расследаванне абставін праводзіць Першамайскі (г. Мінска) раённы аддзел Следчага камітэта. Папярэдне мяркуецца, што ў адзін з калодзежаў ліўневай каналізацыі нехта зліў нафтапрадукты. Іх аб'ём і вінаватыя асобы ўстанаўліваюцца.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении открытых торгов в форме аукциона в отношении права на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, на территории Барановичского района Брестской области

Предмет торгов	Заключение Национальной академии наук Беларуси (от 21.10.2014 № 250-01/1270)		Начальная цена предмета торгов	Размер и срок внесения задатка
	промысловый запас	предельно допустимый объем изъятия		
право на заготовку и (или) закупку виноградной улитки на территории Барановичского района Брестской области	25 000 кг	12 500 кг	50 базовых величин/ 9 000 000 белорусских рублей	3 600 000 белорусских рублей (40% начальной цены) не позднее дня подачи документов
право на заготовку и (или) закупку гадюки обыкновенной на территории Барановичского района Брестской области	2100 экземпляров	210 экземпляров	20 базовых величин/ 3 600 000 белорусских рублей	1 440 000 белорусских рублей (40% начальной цены) не позднее дня подачи документов

Примечание:

1. Торги состоятся **12 марта 2015 г. в 12.00** по адресу: **Брестская область, г. Барановичи, ул. Советская, 79, малый зал райисполкома (каб. 310), 3-й этаж.**

2. Торги проводятся при наличии двух участников и более.

3. Участниками торгов могут быть юридические лица, индивидуальные предприниматели или их представители при наличии доверенности.

4. Для участия в торгах юридическое лицо или индивидуальный предприниматель до их начала подает в комиссию по организации и проведению торгов:

4.1 заявление, с указанием, на какой территории и какие виды диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, предполагается заготавливать и (или) закупать по результатам торгов;

4.2. заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение суммы задатка на расчетный счет Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Брестской области (Барановичский район) 3600211000006 в филиале № 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 150501245, УНП 200676206, назначение платежа 05520.

5. Комиссия по организации и проведению торгов расположена по адресу: **Брестская область, г. Барановичи, ул. Советская, 79, каб. 422, 4-й этаж.** Контактный телефон: **8-0163-41-28-94.** Заявления об участии в торгах принимаются с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням.

6. Прием документов заканчивается **6 марта 2015 г. в 17.00.** Заявления об участии в торгах, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

7. Порядок проведения торгов определен Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. № 699 (с изменениями и дополнениями).

8. Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену за предмет торгов.

9. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, право на заготовку и (или) закупку виноградной улитки и (или) гадюки обыкновенной на территории Барановичского района Брестской области предоставляется этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

10. Победитель торгов подписывает протокол, оформляемый по результатам торгов, в день их проведения.

11. Участник, выигравший торги, возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов в печатных средствах массовой информации не позднее 10 дней с момента проведения торгов.

■ Жыллё

БУДАВАЦЦА ПА СРОДКАХ

Сёлета гадавы план узвядзення жылля з дзяржпадтрымкай плануюць паменшыць амаль на мільён «квадратаў»

Пра гэта паведаміў міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль ЧОРНЫ. Кіраўнік галіны падвёў вынікі за мінулы год і раскрыў нюансы будаўніцтва жылля сёлета.

ГОД З ПЛЮСАМ

Летась усяго па краіне было пабудавана 5 млн 522,4 тысячы квадратных метраў жылля, што на 10% больш за гадавое заданне. Толькі для чаргавікоў тады здалі ў эксплуатацыю 2 млн 352 тыс. кв.м жылля з дзяржпадтрымкай. Міністр адзначыў, што для шмадзетных было пабудавана 501,7 тысячы «квадратаў» жылля. Агульны аб'ём экспарту паслуг і будаўнічай прадукцыі склаў 1 млрд 101 млн долараў. Усе гэтыя паказчыкі сведчаць пра тое, што галіна мае высокі патэнцыял пры пад'ёме эканомікі. Аднак з перспектывамі на бліжэйшы час не ўсё так ясна.

ЛЕПШ МЕНШ, АЛЕ ЯКАСНА І Ў ТЭРМІН

Яшчэ летась у лістападзе Саўмін паставіў задачу будаўнікам узвесці ў 2015 годзе больш за 2,5 млн кв.м жылля з дзяржпадтрымкай. Тады эканамісты падлічылі, што будаўніцтва такога аб'ёму жылля будзе каштаваць бюджэту каля 12 трл рублёў. Апошнія падзеі на айчынным фінансавым рынку і складаная сітуацыя на суседніх рынках прымусілі распрацоўшчыкаў падкарэктаваць амбіцыйныя планы.

Паводле інфармацыі Анатоля Чорнага, сёлета ў краіне плануюць пабудаваць толькі 1,6 млн кв.м жылля з дзяржпадтрымкай. «Гэта тыя рэальныя аб'ёмы, якія пацверджаны крыніцамі фінансавання», — сказаў ён. Такое фінансаванне ў памеры каля 500 млрд рублёў штомесяц прадугледжана роўнымі долямі на працягу года. Міністэрства ўпэўнена, што гэтых сродкаў будзе дастаткова, каб дабудаваць жыллё, узвядзенне якога ўжо пачалося. А вось будоўля новых дамоў будзе весціся ў абмежаванай колькасці — не больш за 2-3 дамы ў кожнай вобласці. «Цяпер асноўная стаўка зроблена на завяршэнне пачатага будаўніцтва. Усе такія дамы будуць уведзены да канца года», — растлумачыў міністр.

А ўсяго, паводле папярэдніх падлікаў спецыялістаў, у краіне будзе пабудавана недзе 4-4,2 млн, а магчыма, і да 5 млн кв.м жылля.

ДЛЯ ЛЬГОТНІКАЎ ЦЭНЫ ЗАМАРОЗЯЦЬ

На жыллё з дзяржпадтрымкай Мінбудархітэктуры плануе стрымліваць цану на працягу усяго года на тым узроўні, які склаўся па стане на снежань 2014-га. А гэта каля 7,5 млн рублёў за квадратны метр. Такі кошт «квадрата» ў сістэме будаўніцтва па дзяржзаказе не вельмі моцна перавышае сярэдні заробак па краіне. Таму цяпер можна смела казаць аб тым, што жыллё з такімі коштамі стане сапраўды даступным для большасці насельніцтва.

УСЕ ДАЎГАБУДЫ ЗНІКНУЦЬ У ЛЮТЫМ

Сёння ў сістэме Мінбудархітэктуры існуе 16 дамоў з перавышэннем нарматыўных тэрмінаў будаўніцтва. Але гэта не тыя праблемныя даўгабуды, што назіраліся ў нас некалькі гадоў таму. Паводле апошняй інфармацыі, у гэтых дамоў існуе перавышэнне нарматыўнага тэрміну ўводу толькі на месяц-два. Міністр запэўніў, што ўжо на працягу лютага ці да канца квартала ўсе гэтыя дамы будуць уведзены ў эксплуатацыю.

Але, яшчэ не факт, што падобныя «ненарматыўшчыкі» на працягу года больш не ўзнікнуць. Міністр растлумачыў, што адной з асноўных прычын з'яўлення будынкаў, тэрміны будаўніцтва якіх не выконваюцца, з'яўляецца праблема з фінансаваннем. Сапраўды, апошні квартал года быў няпростым, калі інвестары шукалі дадатковыя крыніцы фінансавання. Таму адбыўся збой. «Сёння гэта праблема вырашальная», — канстатаваў міністр.

Асноўная стаўка зроблена на завяршэнне пачатага будаўніцтва.

Пры гэтым ён не выключыў, што дамы з нязначным перавышэннем нарматыўнага тэрміну будаўніцтва могуць з'явіцца і сёлета, таму што фінансаванне жылля, якое будуецца з дзяржпадтрымкай, размеркавана раўнамерна на працягу года, а дамоў з высокай ступенню гатоўнасці ўжо цяпер даволі шмат. У ідэале будаўнікі хочуць мець больш сродкаў у першым-другім кварталах, а потым можна атрымліваць і менш, аднак яны размеркаваны раўнамерна. Менавіта таму асобныя дамы і ўводзяцца нясвоечасова.

БЕЛАРУСКАЕ ЖЫЛЛЁ ПАД ПСКОВАМ

Айчынным будаўнікам прапанавана рэалізаваць пілотны праект па ўзвядзенні дзевяці дамоў у Пскоўскай вобласці.

Ужо на наступным тыдні плануецца аднавіць перамовы з адміністрацыяй вобласці на гэты конт. Беларускаму боку прапануецца асвоіць зямельны ўчастак плошчай каля 40 га для першага пілотнага праекта па будаўніцтве 9 дамоў буйнапанэльнага домабудаўніцтва (БПД). Таму адразу некалькі домабудаўнічых камбінатаў са сваімі праектамі і прапановамі выязджаюць у гэты рэгіён. Міністэрствам распрацоўваюцца розныя схемы крэдытавання праз беларускія банкі.

Так, гэта не зусім простая схема па атрыманні валюты за мяжой. Аднак, галоўнае сёння — загрузіць беларускія будаўнічыя прадпрыемствы.

Асобна міністр паведаміў, што выключна прадпрыемствы Мінбудархітэктуры летась павялічылі аб'ём экспарту паслуг амаль у два разы ў параўнанні з 2013 годам да 196,4 млн долараў. Што да экспарту прамысловых тавараў, то ў фізічных аб'ёмах тэмп росту склаў 110,5%, аднак пры пераліку ў доларавым эквіваленце гэты паказчык (547 млн долараў) стаў нават на 8 млн меншы.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Транспарт

ЕЗДЗІЦЬ У РАСІЮ СТАНЕ ТАННЕЙ,

у Літву — хутчэй, а адмяняць цягнікі ва Украіну і Варшаву пакуль не будуць

Кошты на праезд у цягніках міжнародных зносін (у першую чаргу ў Расійскую Федэрацыю) значна знізяцца з 10 лютага. Пра гэта паведаміў журналістам першы намеснік начальніка пасажырскай службы ўпраўлення беларускай чыгункі Андрэй КАШКО.

— Разам з расійскімі чыгуначнікамі мы прыйшлі да радыкальных крокаў па зніжэнні кошту праезду. З улікам існуючых тарыфных планаў і зніжак, якія мы напрацавалі летась, зніжэнне кошту складзе да 50% амаль па ўсіх катэгорыях вагонаў, — распавёў Андрэй Кашко.

Спецыяліст патлумачыў, што тарыфы на праезд фарміруюцца ў швейцарскім франку, і ваганні яго і нашай нацыянальнай валюты адносна больш важкіх валют дыктуюць гэтыя змены. Паколькі 17 студзеня адбылося адцягненне швейцарскага франка з кошыка еўрапейскіх валют, значна выраслі цэны. Таму ўзнікла неабходнасць у захадах, накіраваных на прыцягненне пасажыраў на чыгуначны транспарт і павышэнне канкурэнтаздольнасці міжнародных чыгуначных перавозак.

Кошт праезду ў Маскву з улікам толькі гэтага зніжэння патаннее на суму ад 200 тысяч рублёў да мільёна — у залежнасці ад катэгорыі вагона. Апроч таго, гэтыя зніжкі будуць павялічвацца ўдвая з улікам існуючых тарыфных планаў, якія дзейнічаюць у залежнасці ад дня набыцця праязнога дакумента, месца размяшчэння пасажыра ў вагоне, састава і далёкасці паездкі.

Андрэй Кашко патлумачыў, чаму такія змены закранаюць толькі цягнікі расійскага напрамку.

— Гэта самы буйны наш партнёр, які ў сегменце міжнародных чыгуначных перавозак займае каля 70%. Да таго ж самымі запатрабаванымі і пасажыранапружанымі кірункамі з'яўляюцца Масква і Санкт-Пецярбург (80% ад усіх перавозак з Расіяй).

Такім чынам, калі сёння праезд да Масквы ў вагоне СВ каштуе каля трох мільёнаў рублёў, то з улікам зніжэння з 10 лютага тарыф апусціцца да двух мільёнаў. Квіток у плацкартны вагон, які каштуе 800 тысяч рублёў, патаннее да 500 тысяч, цана на купэйны квіток з 1,5 млн рублёў знізіцца да 1 млн. Апроч таго, праз дзень у расійскую сталіцу ходзіць і цягнік «Брэст — Масква», у складзе якога ёсць так званы сядзячы «вагон-самалёт». Там кошт квітка знізіцца з 630 да 400 тысяч рублёў. І гэта без уліку тарыфных планаў, пра якія Андрэй Кашко таксама распавёў:

— Калі пасажыр за месяц і больш купляе праязны білет, яму даецца зніжка ў 15%. Калі людзі едуць у складзе групы 10 чалавек у Маскву, яны таксама атрымліваюць зніжку ў 15%. А калі група едзе, скажам, у Екацярынбург, то зніжка складзе яшчэ 30% да ўжо зніжанай з 10 лютага цаны.

У любым выпадку, мінімальнае зніжэнне цэн на цягнікі, што курсіруюць паміж Беларуссю і Расіяй, складзе 35%, а з улікам далёкасці паездкі і групавых зніжак — больш за 50%. Новаўвядзенне закране толькі цягнікі расійскага і беларускага фарміраванняў і не будзе распаўсюджвацца на саставы, што ідуць праз нашу краіну транзітам.

Астатні сегмент міжнародных чыгуначных перавозак займаюць Украіна, Літва і Польшча. З імі беларускі бок таксама праводзіць перамовы па фарміраванні коштаў на праезд.

— З Літвой мы трымаем сацыяльны тарыф. Кошт праезду ў нашых цягніках адэкватны цяперашняй сітуацыі і рэакцыі на рынак транспартных паслуг наогул у гэтым кірунку. Мы глядзім, як працуюць аўтамабільныя перавозчыкі, авіяцыя і трымаем нейкі парытэт цаны, — адзначыў першы намеснік начальніка службы.

Ён нагадаў, што паэтапна была рэалізавана праграма па паскарэнні перавозак паміж Мінскам і Вільнюсам за кошт таго, што мытны агляд у чатырох цягніках цяпер праводзіцца непасрэдна падчас руху на ўчастку паміж Маладзечнам і Гудагаем. Цяпер дзякуючы гэтаму дарога займае 2,5 гадзіны. Аднак увесці такую сістэму для ўсіх цягнікоў да літоўскай сталіцы пакуль немагчыма.

— Мы не разглядаем змяншэнне частаты цягнікоў на гэтым кірунку, — заявіў Андрэй Кашко, маючы на ўвазе цягнікі, якія ідуць у Вільнюс цягам чатырох гадзін з малой запаўняльнасцю. — Мы разглядаем пытанне аптымізацыі нашых выдаткаў і павышэння выкарыстання гэтых саставаў.

Што да далейшага скарачэння шляху ў вільнюскім кірунку, то калі ў Вільнюс пусціць электрацягнікі, то час у дарозе складзе дзве гадзіны. Аднак сёлета гэты праект рэалізаваны не будзе.

Беларускія чыгуначнікі дамовіліся з іншымі чыгуначнымі адміністрацыямі (а гэта ў тым ліку Казахстан, Латвія, Украіна, Літва) пра тое, што кошты ў тарыфнай валюце ў 2015 годзе павышацца не будуць і захаваюцца на ўзроўні 2014 года.

Таксама спецыяліст запэўніў, што цягнікі ва Украіну пакуль будуць хадзіць без змен, цэны на квіткі зніжацца таксама не будуць. Паводле перамоў з польскімі чыгуначнікамі, цягнік «Мінск — Варшава», які трапіў пад пагрозу адмены, пакуль усё ж будзе курсіраваць. Будуць прымацца захады па павышэнні яго запаўняльнасці, не выключаны і падобныя на беларуска-расійскія зніжкі і акцыі.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

Тым часам

Штрафы і кошт праезду вырастуць

Аб гэтым стала вядома падчас пасяджэння калегіі Міністэрства транспарту і камунікацый у Оршы

Як паведаміў міністр транспарту і камунікацый Анатоль СІВАК, гаворачы аб асноўных задачах у 2015 годзе, якія датычаць аўтамабільнага і гарадскога электрычнага транспарту, сёлета будзе праведзена «падрыхтоўка адпаведных нарматыўных прававых актаў у частцы павелічэння памеру штрафаў за безбілетны праезд пасажыраў, узмацнення адміністрацыйнай адказнасці за правапарушэнні ў сферы аўтамабільных перавозак пасажыраў, пашырэння паўнамоцтваў Транспартнай інспекцыі на права складання і разгляду спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях у сферы аўтамабільных перавозак пасажыраў».

А **Дзмітрый КРУТОЙ, намеснік міністра эканомікі**, распавёў пра рост тарыфаў на транспарт: «У чыгуначных рэгіянальных і міжрэгіянальных перавозках тарыфы плануецца падняць на 70%. 30-35% у красавіку, і столькі ж у ліпені. Для гарадскога транспарту ў Мінску — на 11-12%, у абласцях — на 14-16%, для аўтамабільнага прыгараднага транспарту — на 10-15%. Гэта запланавана на красавік».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Справа лётная

З МАГІЛЁВА — У БАЛГАРЫЮ

Сёлета самалёты «Белавія» паляцяць на вядомыя курорты з самых вялікіх гарадоў краіны

Пра гэта паведаміў Анатоль ГУСАРАЎ, генеральны дырэктар авіякампаніі. Як падкрэсліў спадар Гусараў, для падобных пералётаў будуць задзейнічаны ўсе абласныя аэравакзалы. Для дасведчаных турыстаў маршруты добра вядомы — Балгарыя, Турцыя, Грэцыя, Егіпет і Туніс. З Мінска таксама пашырацца геаграфія палётаў і колькасць рэйсаў у найбольш папулярных напрамках: Цівat (Чарнагорыя), Варна, Бургас (Балгарыя), Салонікі (Грэцыя)... Дарэчы, летась у 46 краін свету «Белавія» было выканана 2494 чартары, што на 38,5 працэнта пераўзыходзіць паказчыкі 2013 года. Пры гэтым у мінулым годзе з'явіўся цэлы шэраг новых чартарных і турыстычных напрамкаў з Мінска ў Італію, Румынію, Туніс і на Кіпр.

Летась «Белавія» распачала палёты па трох новых кірунках. З Нацыянальнага аэрапорта «Мінск», напрыклад, стала магчымым паляцець у французскую Ніцу.

— Гэта, безумоўна, летні напрамак, — падкрэслівае **Ігар ЧАРГІНЕЦ, намеснік генеральнага дырэктара «Белавія»**. — Многія авіякампаніі, якія ляцяць летам у Ніцу, зімой спыняюць рэйсы. Для нас гэта першы падобны вопыт. І я ўжо магу казаць, што рэйс цікавы і даволі паспяховы. На гэтым напрамку мы ўбачылі не толькі заможных пасажыраў. У французскіх курортных гарадах хапае таксама і бюджэтных атэляў. Нашы турфірмы пачынаюць працаваць у гэтым кірунку. А найбольш папулярным напрамкам для нас, безумоўна, з'яўляецца Масква.

Пры гэтым Ігар Чаргінец адзначыў паспяховасць палётаў у Тэль-Авіў, Ларнаку, Рым, Мілан... Палепшылася сітуацыя па рэйсах у Сочы.

Як ужо паведамлялася, флагман пасажырскай авіяцыі чакае рэбрэндынг, падрыхтоўку да якога «Белавія» вядзе ў цесным супрацоўніцтве са славутай кампаніяй «Боінг».

— Усе чакаюць, што падобнае рашэнне мы прымем ужо заўтра, — кажа Чаргінец. — Работа насамрэч ідзе. Спадзяюся, ужо сёлета мы здолеем прэзентаваць знешняе праяўленне праекта. А новыя ліўрэі, мяркую, зможам паказаць на новых «Боінгах», якія паступяць у сярэдзіне 2016 года.

Тарас ШЧЫРЫ

■

ПІСЬМЕННІКІ СВЕТУ ЗБІРАЮЦЦА Ў МІНСКУ

Сярод іншых сустрэч у межах XXII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь праводзіць міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час». Для ўдзелу ў дыскусіях, стасунках з беларускімі калегамі прыедуць мастакі слова з 18 краін свету. Сёння ўдзельнікі прадстаўнічага форуму дзеляцца сваімі развагамі пра вагу мастацкага слова ў свеце, пра тое, з якімі думкамі едуць у Беларусь.

Чынгіз Алі аглу (Азербайджан), паэт, перакладчык:

— Мне досыць часта даводзіцца быць госцем чыстай і светлай Беларусі. У мяне тут шмат сяброў. Я бываў у Хатыні, Брэсцкай крэпасці, іншых менш вядомых мясцінах, звязаных з памяццю пра Вялікую Айчынную вайну. Народ Беларусі ведае цану пакутам, здольны асэнсаваць, якім бывае драматызм чалавеканенавісных боек. Мір, бяспека жыцця — сапраўдныя мастакі слова перакананы ў важкасці гэтых прыярытэтаў у нашым існаванні ў свеце. Літаратура абавязана спрыяць усталяванню міру.

Валерый Казакоў (Расія), паэт, празаік, старшыня ФНКА «Беларусы Расіі»:

— Можна толькі падзякаваць Міністэрству інфармацыі Беларусі, кіраўніцтву Беларусі за арганізацыю такой пісьменніцкай сустрэчы. Нам, людзям, якія асабліва чуйныя да слова, варта аб'ядноўвацца, збіраць разам здаровыя сілы, здольныя захаваць прагрэс, здольныя паўплываць на развіццё і пашырэнне гуманізму. Мінск — сапраўдная пляцоўка для мірастваральнага будаўніцтва.



Ато Хамдам (Таджыкістан), празаік, драматург:

— У Беларусі шмат ініцыятыў, якія кансалідуюць супрацоўніцтва, дружбу народаў і дружбу літаратур. Я ганаруся, што з'яўляюся членам Саюза пісьменнікаў Беларусі. Адчуваю і свае абавязкі перад чытачом ужо ў сябе дома, дзе я павінен з дня ў дзень расказваць пра вашу краіну, ваш народ, пра тыя сацыяльныя, палітычныя здабыткі, што вамі засвоены ў апошнія гады. Усе разумныя людзі ведаюць, што такія дасягненні ажыццёўлены пад кіраўніцтвам лідара краіны — Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.

Святлана Ананьева (Казахстан), літаратуразнаўца:

— Мне імпануе руплівасць беларускіх пісьменнікаў у развіцці міжнародных сувязяў. Ведаю, колькі намаганняў яны прыкладваюць для развіцця школы мастацкага перакладу. Да тых некалькіх дзясяткаў кніг казахскіх аўтараў, што былі выдадзены ў Беларусі да 1991 года, сёння дадаюцца новыя зборнік паэзіі і прозы. Нядаўна Мікола Мятліцкі пераклаў вершы Абая — яны выйшлі асобнай кнігай пад назвай «Стэпавы прастор». Убачылі свет дзве кнігі пякучай, шчымлівай белетрыстыкі вучонага і пісьменніка Немата Келімбетава — «Не хачу губляць надзею» і «Пісьмы сыну». Дзякуй вам, беларусы, што вы адкрываеце Казахстан, казахстанскае асветніцтва, што вы любіце нашу краіну, нашу культуру, з павагай ставіцеся да ўсяго свету.

Мікола БЕРЛЕЖ.
Фота Наталлі АСМОЛЫ і Надзеі БУЖАН.

■ Прэстыж прафесіі

Міхаіл ЖУРАЎКОЎ:

«У ШКОЛЫ ВЯРТАЕЦЦА КУРС «СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА»

Міністр адукацыі мае намер разабрацца з выкананнем настаўнікамі неўласцівых для іх функцый

Міхаіл Жураўкоў падкрэсліў, што гэтай праблемай ён займаецца з першага дня свайго знаходжання на пасадзе міністра. Паводле яго слоў, цяпер праводзіцца маніторынг школ і гімназій па ўсёй краіне. Пра гэта ён паведаміў падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА. «Вывучаем статыстыку, глядзім структуру даручэнняў, якія выконваюцца настаўнікамі, і высвятляем, хто іх дае. Акрамя таго, абмяркоўваем з настаўнікамі, дырэктарамі і прадстаўнікамі раённай улады, якім яны бачаць сваё ўзаемадзеянне ў будучыні. Паспрабуем як мага хутчэй абагульніць гэтыя матэрыялы і сфармуляваць рэкамендацыі», — паабяцаў міністр.

Павышэнне прэстыжу прафесіі настаўніка, на думку кіраўніка галіны, важная місія, але гэта задача не толькі для Міністэрства адукацыі, а для ўсяго грамадства:

— Трэба ствараць у нашым грамадстве станоўчы вобраз настаўніка. Для гэтага неабходна і СМІ прыцягваць, больш расказваць пра нашых выдатных педагогаў, пра іх інавацыі…

Міністэрства адукацыі, са свайго боку, будзе старацца стварыць самыя аптымальныя ўмовы для таго, каб педагогі працавалі ў творчых і камфортных умовах, будзе клапаціцца пра іх матэрыяльнае заахвочванне…

Базавы падручнік

Міхаіл Жураўкоў паведаміў, што летам выпускнікі 9-х класаў будуць здаваць тры выпускныя экзамены — па беларускай, рускай мовах і матэматыцы (усе ў пісьмовай форме). З 2015 года абавязковы экзамен па гісторыі Беларусі будуць здаваць толькі выпускнікі 11-х класаў.

«Цяпер нашы спецыялісты распрацоўваюць крытэрыі адбору для залічэння ў 10-я профільныя класы. Але пры гэтым мы захаваем і звычайныя 10-я класы для дзяцей, якія не змаглі вызначыцца з профілем, дзе ўсе прадметы будуць вывучацца на базавым узроўні», — адзначыў міністр.

Ён дадаў, што на базе некаторых устаноў адукацыі краіны ў гэтым навучальным годзе праводзіцца эксперыментальны праект па апрабацыі мадэлі незалежнай выніковай атэстацыі вучняў базавай школы. І толькі пасля яго завяршэння можна будзе праводзіць выпускныя іспыты для дзевяцікласнікаў па такой мадэлі.

У міністра адукацыі пацікавіліся, што ён думае наконт якасці і даступнасці выкладання матэрыялу ў школьных падручніках, а таксама магчымасці вяртання да праверaных часам і многімі пакаленнямі школьнікаў савецкіх падручнікаў.

— Калі вы спытаеце бабуль, дзядуляў, бацькоў, яны скажуць вам, што гэта праблема была заўсёды і, напэўна, будзе. Нельга напісаць падручнік, які б задаволіў усіх без выключэння. Але ў нас узнікла ідэя стварэння базавага падручніка. Базавы падручнік — гэта падручнік, які будзе змяшчаць пэўны набор базавых ведаў, якімі павінен валодаць кожны вучань. Да базавага падручніка будуць выдадзены рэкамендацыі па велізарнай колькасці дадатковых матэрыялаў. Дадатковыя матэрыялы — гэта і інтэрнэт-рэсурсы, дадатковыя падручнікі альбо метадычныя матэрыялы. Іх будзе вызначаць альбо сам настаўнік-прадметнік, альбо педсавет.

Напрыклад, калі настаўнік профільных класаў працуе з моцнымі вучнямі, то ён, акрамя базавага падручніка, можа даць ім і вялікую колькасць дадатковага матэрыялу, які можа быць ім карысным. Дадатковыя матэрыялы могуць абнаўляцца кожны год, таму што інфармацыя мяняецца вельмі хутка. У той час як падручнікі пішуцца вельмі скрупулёзна, і перапісваць іх кожны год мы не можам. Таму пяройдзем да базавага падручніка і дадатковых матэрыялаў, — патлумачыў міністр. — Але проста так базавы падручнік не з'явіцца. Мы цяпер думаем над тым, якой павінна быць сістэма адбору калектыву для напісання базавага падручніка і як будзе праходзіць конкурс па яго напісанні.

Таксама Міхаіл Жураўкоў паведаміў, што з наступнага года ў школы вяртаецца курс «Сусветная мастацкая культура». У кожнай паралелі ён будзе называцца па-свойму, у залежнасці ад таго, што менавіта будзе вывучацца ў канкрэтным класе.

«Тэст» на наркотыкі

Міністр адукацыі расказаў, што з наступнага навучальнага года сярод беларускіх школьнікаў, навучэнцаў і студэнтаў плануецца праводзіць псіхасацыяльнае анкетаванне на схільнасць да наркотыкаў.

— Усе павінны разумець, якое зло нясуць наркатычныя сродкі, псіхатропныя рэчывы і іх аналагі. Спецыяльна для ўзмацнення барацьбы з гэтай згубнай з'явай міністэрствамі адукацыі, унутраных спраў, аховы здароўя распрацаваны комплекс мерапрыемстваў па прадухіленні распаўсюджвання алкаголю, наркатычных і псіхатропных рэчываў сярод навучэнцаў, — расказаў Міхаіл Жураўкоў. — Акрамя гэтага дакумента, спецыялістамі распрацаваны парадак правядзення псіхасацыяльнага анкетавання і медыцынскага абследавання. Сёння спецыялісты ўстаноў адукацыі праводзяць з бацькамі работу, тлумачаць ім важнасць правядзення такога анкетавання. Нам бы хацелася, каб анкетаванне не стала стрэсам для дзяцей, не ўсхвалявала бацькоў, пры гэтым каб была захавана максімальная канфідэнцыяльнасць інфармацыі. Вось менавіта гэты аспект цяпер і прапрацоўваецца спецыялістамі. Як вырашыць, хто мае права доступу да інфармацыі, і як засцерагчы асабістыя даныя дзіцяці.

Акрамя падрыхтоўкі бацькоўскай грамадскасці, ёсць яшчэ адно важнае пытанне, без якога немагчыма якасна правесці такое анкетаванне — трэба падрыхтаваць спецыялістаў, якія будуць яго праводзіць. Усю вясну інстытуты развіцця адукацыі будуць рыхтаваць педагогаў-псіхолагаў і класных кіраўнікоў да правядзення анкетавання. Міністр адукацыі расказаў, што ўвесь мінулы год у некалькіх установах адукацыі вялася апрабацыя такога анкетавання.

Парогавыя ацэнкі на ЦТ

Адказваючы на пытанне: «Калі ў абітурыентаў з'явіцца магчымасць падаваць свае дакументы адразу ў некалькі ВНУ?» — Міхаіл Жураўкоў паведаміў, што сёння такое пытанне не разглядаецца. «Гэта значыць, што ў бягучым і наступным навучальным годзе абітурыент павінен будзе падаваць дакументы ў канкрэтную ВНУ. У перспектыве, можа быць, мы да гэтага і прыйдзем, але не ў бліжэйшыя гады», — удакладніў міністр.

Пры гэтым Міхаіл Жураўкоў не выключае ў будучыні і павелічэння колькасці тэстаў, якія зможа здаваць адзін чалавек у ходзе цэнтралізаванага тэсціравання: «Будзем думаць, таму што няма абсалютна правільнай і дасканалай сістэмы адбору. Трэба ісці наперад, заўсёды ёсць што ўдасканальваць». Пры гэтым ён адзначыў, што ў любым выпадку правілы гульні будуць вызначаны загадзя. Пра новыя правілы паступлення ў ВНУ абвесцяць як мінімум за год.

Фота БЕЛТА.

Першае і, напэўна, самае галоўнае, што цікавіць абітурыентаў 2015 года, — гэта парогавыя балы па прадметах ЦТ. Яны змяняцца не будуць. «Мінімальная колькасць балаў, якую неабходна набраць абітурыенту на ЦТ, застанецца ранейшай, — запэўніў міністр. — Іншая справа, што мы крыху зменім падыход — будзе ўведзена паняцце «профільны прадмет». Зменіцца і працягласць перыяду падачы дакументаў абітурыентамі — колькасць дзён для падачы ў асноўную хвалю павялічыцца, затое зменшыцца колькасць дзён для тых, хто будзе падаваць дакументы ў рамках правядзення дадатковага набору. Іншых істотных змен, якія паўплываюць на лёс абітурыентаў і іх план падрыхтоўкі, не плануецца».

Што датычыцца плана набору на бюджэт, то ён можа вар'іравацца ў залежнасці ад колькасці выпускнікоў школ. Сёлета колькасць выпускнікоў школ засталася практычна на леташнім узроўні, таму колькасць бюджэтных месцаў у ВНУ зменшыцца нязначна.

Дзіцячы садок — не «камера захоўвання»

«Хто прымае рашэнне аб выключэнні дзіцяці з дзіцячага садка і чаму было вырашана, што падставай для адлічэння могуць стаць 30 дзён, прапушчаных дзіцем без уважлівай прычыны?» — пацікавіліся ў міністра адукацыі.

— Выключыць дзіця з дзіцячага садка без уважлівай прычыны ніхто не мае права, — запэўніў Міхаіл Жураўкоў. — Ніхто не можа гэтага зрабіць неабгрунтавана, не вывучыўшы ўсе абставіны, якія спрыялі таму, што дзіця перастала наведваць дашкольную ўстанову. Калі маці працуе дзень праз два ці тата можа пасядзець з дзіцем у будны дзень, то, натуральна, гэта трэба абгаварыць з загадчыцай садка.

Пры гэтым міністр удакладніў, што ў Кодэксе аб адукацыі ёсць раздзел, які рэгулюе наведванне ўстановы адукацыі: падпунктам 5.6 пункта 5 артыкула 79 вызначана, што датэрміновае спыненне адукацыйных адносін па ініцыятыве кіраўніцтва ўстановы (у тым ліку ўстановы дашкольнай адукацыі) ажыццяўляецца ў выпадку працяглай адсутнасці (больш за 30 дзён) на занятках без уважлівых прычын на працягу навучальнага года (за выключэннем канікулярнага часу, які не ўлічваецца як пропуск без уважлівых прычын: гэта 90 каляндарных дзён летам, 10 каляндарных дзён зімой і 10 каляндарных дзён вясной). Гэты пункт датычыцца ўсіх устаноў адукацыі, а не толькі дашкольных.

«Так зроблена таму, што ні дзіцячы садок, ні школа, ні прафтэхустанова не з'яўляюцца, так бы мовіць, «камерай захоўвання». Гэта ўстановы, якія прадастаўляюць адукацыйныя паслугі, і бацькі абавязаны вырашыць для сябе: будуць яны імі карыстацца або адмовяцца ад іх.

Мы лічым, што кіраўнік установы дашкольнай адукацыі мае права самастойна ў кожным асобным выпадку (з улікам канкрэтных абставін) вырашаць пытанне аб тым, ці з'яўляюцца тыя ці іншыя прычыны адсутнасці выхаванца ўважлівымі. Так ці інакш, рашэнне аб захаванні месца выхаванца ва ўстанове дашкольнай адукацыі прымаецца ў інтарэсах дзяцей», — падкрэсліў Міхаіл Жураўкоў. Ён растлумачыў, што калі ўзнікаюць спрэчкі, то пытанне вырашаецца аддзелам (упраўленнем) адукацыі, спорту і турызму, на тэрыторыі якога знаходзіцца дзіцячы садок.

«Нам бы хацелася, каб анкетаванне не стала стрэсам для дзяцей, не ўсхвалявала бацькоў, пры гэтым каб была захавана максімальная канфідэнцыяльнасць інфармацыі».

«Справа ў тым, што дастаткова складана вызначыць на заканадаўчым узроўні вычарпальны пералік уважлівых прычын, па якіх дзіця можа адсутнічаць у дзіцячым садку. Напрыклад, бацькі з'ехалі за мяжу больш чым на паўгода, і дзіця з'ехала разам з імі, але яны не напісалі заяву аб тым, што просяць выключыць дзіця з ліку выхаванцаў дзіцячага садка. Таму і захоўвалася за ім гэтае месца. Такога быць не павінна», — рэзюмаваў Міхаіл Жураўкоў.

Міністр адукацыі паведаміў, што ў Беларусі цяпер працуе 10 прыватных устаноў, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі (сем у Мінску, адна ў Мінскай вобласці і дзве ў Магілёўскай). З мінулага года спрошчаны патрабаванні ў плане адкрыцця сямейных дзіцячых садкоў на першых паверхах існуючага жыллёвага фонду (катэджнай забудовы). Гэта было зроблена, каб стымуляваць стварэнне ўстаноў адукацыі прыватнай формы ўласнасці.

— Я больш чым упэўнены, што цяпер многае будзе залежаць ад мясцовай выканаўчай улады і жадання людзей. На мясцовым узроўні, мы спадзяёмся, у бліжэйшы час будзе наладжана работа па істотным развіцці сеткі такіх устаноў, стварэнні для гэтага адпаведных умоў. Думаю, што трэба скласці ў кожным рэгіёне пералік будынкаў і памяшканняў, якія могуць быць аддадзены пад прыватныя дзіцячыя садкі. Для дашкольнай адукацыі цяпер вельмі актуальнае дзяржаўна-прыватнае партнёрства, паколькі, выкарыстоўваючы традыцыйныя падыходы пры арганізацыі дашкольнай адукацыі толькі за кошт дзяржаўных сродкаў, вырашыць гэтую праблему будзе складана, — дадаў Міхаіл Жураўкоў.

Надзея НІКАЛАЕВА

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

«Вось гэта, я разумею,— машына».

Навіна пра тое, што беларускі экіпаж у агульным заліку трапіў у дзясятку найлепшых на ралі «Дакар-2015», мабыць, парадавала прыхільнікаў гэтага спаборніцтва. Усе тры нашы экіпажы дайшлі да фінішу, пераадолеўшы 13 этапаў і больш за 8000 кіламетраў... Мы сустрэліся з тым, хто назіраў за гэтай спартыўнай гонкай непасрэдна на месцы падзей, І распыталі вядучага «Навін спорту», спецыяльнага карэспандэнта тэлеканала АНТ Ігара Старавойтава пра экстрым з рызыкай для жыцця і закадравыя эмоцыі на гоначнай трасе...

Ігар СТАРАВОЙТАЎ:

«Тыя, хто выязджае на трасу «Дакара», жывуць з адрэналінам у крыві...»

ПРАЦОЎНЫЯ БУДНІ ЯК РАЛІ

— Ігар, якія ўражанні засталіся ад «Дакара-2015»?

— Кожны гоншчык вам скажа, што гэта самая складаная гонка на планеце, дзе кожны год мяняецца маршрут, з'яўляюцца дадатковыя ўмовы. І складаны «Дакар» для ўсіх, хто мае да яго дачыненне: як для арганізатараў, тэхнічных службаў, так і для журналістаў, якія займаюцца асвятленнем маштабнай падзеі. Адны працуюць, пераязджаючы штодня з бівака ў бівак, дзе размяшчаюцца тэхнічныя базы (там удзельнікі збіраюцца пасля этапу, рамантуюць машыны, адпачываюць), а мы выязджалі яшчэ і на трасу. Адпраўленне раніцай, каб паспець на месца прызначэння раней за гоншчыкаў. Шукаем цікавыя ракурсы для здымак і чакаем удзельнікаў. Для перасоўвання журналісты таксама выбіралі розныя спосабы. Мы ездзілі на машыне, а некаторыя з самалёта сачылі за развіццём падзей. Паколькі расказвалі пра беларускую каманду, то цікавіліся перш за ўсё нашымі грузавікамі. Варта ўлічваць, што гонка праходзіла ў Паўднёвай Амерыцы, а гэта і розніца ў часе, і па клімаце іншыя ўмовы. У гэтым годзе нам хапіла ўсяго: быў дождж, моцны вецер і спякота да плюс пяцідзесяці градусаў...

— Трапілі з зімы ў лета...

— Многія лічаць, што мы нібы з'ездзілі на адпачынак, а насамрэч усё не так. Бо такая паездка — гэта два тыдні знясільваючай працы, калі нават спіш толькі па тры-чатыры гадзіны ў суткі. Звычайна прылятаеш і спіш ноч, а потым днём бадзёры, але на гэты раз не давялося нават на іншы час перастроіцца: прыляцелі — і працаваць... Увесь час у дарозе. Думаеш, як лепш зняць, куды ехаць і каб паспець усё перадаць у сюжэце на Мінск. З такім рэжымам нават у дарозе не падрэмлеш, дый на складанай трасе важна не губляць пільнасці.

— Як успрымаеце такога кшталту камандзіроўкі?

— Калі знаходзішся там, то здаецца, што больш ні за што ў жыцці на такое не «падпішашся». А вяртаешся дадому, астываеш і праз нейкі час разумееш, як жа было класна. Сёлета я пабываў на «Дакары» ўжо другі раз і, прызнаюся, напярэдадні восенню проста жыў чаканнем гэтай паездкі. Прыехаў на ралі, пачаліся працоўныя будні, і зноў лавіў сябе на думцы: «Што ты тут забыў?» Ацэньваеш убачанае і перажытае, мабыць, толькі вярнуўшыся дадому, калі пераглядаеш відэа і фотаздымкі.

КАРОТКІ СЮЖЭТ З НЕПРАДКАЗАЛЬНЫХ ЗАСАД

— У навінах мы бачым сюжэты ў некалькі хвілін. Што застаецца за кадрам?

— У нашай працы галоўная складанасць — гэта наяўнасць сувязі і інтэрнэту. Таму што Аргенціна — вельмі вялікая краіна і не ўся яна пакрыта мабільнай сувяззю. Бывала, што мы прыязджалі на кропку здымак, але не ведалі дакладна, дзе знаходзяцца на маршруце нашы грузавікі. Па інтэрнэце заўсёды можна адсочваць, якія кантрольныя пункты яны праехалі, і на аснове гэтага разлічваць час іх з'яўлення, а пры адсутнасці сувязі ты прыходзіш і чакаеш. Розных такіх нюансаў вельмі шмат. Іх не бачаць гледачы, якія ўключаюць навіны з кароткім сюжэтам, дзе ўсё дынамічна і прыгожа... Мы ж сядзім у пустыні і цярпліва чакаем каманды, цікавых момантаў, калі, напрыклад, грузавік вылятае з-за павароту альбо бачым скачкі машын, абгон. Толькі потым з усіх здабыткаў складаецца гатовая карціна сюжэта. Сёлета мы зрабілі новы крок (хаця гэта лічыцца ўжо усветнай тэндэнцыяй) — узялі з сабой квадракоптар. Ён

«Паляванне» на лепшыя кадры.

нечым падобны на верталёт, толькі з чатырма вінтамі і выкарыстоўваецца для падымання камеры ў паветра. Паветраныя здымкі заўсёды даюць выйгрышныя кадры. Аднак паколькі быў моцны вецер, то змаглі выкарыстоўваць такое прыстасаванне не так часта, як жадалі. Дадайце да ўсяго спякоту, пыл, што забіваецца ўсюды: у тэхніку, вопратку — і перашкаджае нават дыхаць.

— На «Дакары» ў гэтым годзе некаторыя каманды сыходзілі з дыстанцыі...

— Гэта непазбежна. Калі ў мінулым годзе з 74 грузавікоў да фінішу дайшло каля 50, то сёлета з 63 даехалі 43. Праехаць «Дакар» — вялікае дасягненне. Наколькі я ведаю, сярод удзельнікаў былі людзі розных прафесій. Некаторыя з іх доўга збіралі грошы, каб стаць удзельнікамі. І гэта сапраўднае мужчынскае выпрабаванне, бо ў пустыні ў 45 градусную спякоту можа рознае здарыцца. Арганізатары робяць усё ад іх залежнае, каб не адбылося трагедый. У кожнага ўдзельніка, які выязджае на трасу, у машыне ёсць спецыяльная прылада, па якой можна адсочваць, дзе ён знаходзіцца. Калі нехта спыняецца на трасе, то павінен паведаміць прычыну, у адваротным выпадку арганізатары адразу будуць рэагаваць...

Умовы вельмі жорсткія. Калі ў Аргенціне часцей сустрэнеш горы, стэп, то Чылі — скрозь пустыня. І маршрут праходзіць у розных умовах. На машыне можна перакуліцца і ў які каньён забурыцца, а калі ехаць павольна, то ёсць рызыка засесці ў пяску. Каб проста праехаць трасу «Дакара» патрэбна не абы-якая вытрымка, а зрабіць гэта на хуткасці 140-170 кіламетраў здольны толькі людзі асобага складу. І вельмі ўцешна, што наша каманда паказвае такія выдатныя вынікі, хоць і ўдзельнічае ў «Дакары» толькі чацвёрты раз. Бывае, кажуць: што там беларуская ў МАЗе? Паверце, больш, чым расійская ў КАМАЗе.

Дарэчы, «камазаўцы» спачатку даволі насцярожана ставіліся да нашых удзельнікаў, але з часам адносіны сталі больш цёплымі. Нашы ж былі настроены на добрыя вынікі і праяўлялі сябе выдатна. Напрыклад, на адным з этапаў у іх былі ўсе шанцы стаць першымі, аднак праз гісторыю з непастаўленай пячаткай прайгралі з розніцай у 45 секунд. У машыны ёсць кантрольная картка, дзе трэба адзначаць праезд кантрольных пунктаў. І на адным з іх экіпажу Сяргея Вязовіча суддзя не паставіў пячатку. Калі гэта заўважылі, давялося вяртацца, і беларусы страцілі час і пазіцыі ў этапе гонкі...

— З аднаго боку, вы на працы. Але ж гэта не адмяняе жывой рэакцыі на падзеі?

— Там прасякаешся экстрымам. Прысутнічае пачуццё таго, што ты маеш да падзеі дачыненне. Зразумела, з нашай камандай я не першы дзень знаёмы, бо ўжо другі раз быў на «Дакары», а да таго быў «Шаўковы шлях». Мы ў добрых адносінах, і хлопцы з каманды адкрытыя да дыялогу, калі мне трэба каментар ці інтэрв'ю. На ралі я даўно ўжо не балельшчык, але за сваіх шчыра перажываю. Хочацца, каб і вынікі былі выдатнымі, каб на нашу каманду звярнулі ўвагу. Можа, гэта паспрыяе нават таму, што аўтаспорт выйдзе ў нашай краіне на новы ўзровень.

З такім штурманам не заблукаеш.

ПРЫГОДЫ З НЕЗАБЫЎНЫМІ ЎРАЖАННЯМІ

— Чаму людзі выбіраюць такі спорт?

— Тут, мабыць, спалучаюцца прага экстрыму і жаданне зведаць сваю выносліваць. Тыя, хто выязджае на трасу, жывуць з адрэналінам у крыві і такія спаборніцтвы для іх свайго роду падсілкоўванне. Калі браць прафесіянальныя каманды, як наша, то яе ўдзельнікі таксама жывуць гэтым. У іх падрыхтоўка да «Дакара» ідзе цэлы год: свае трэніроўкі, паралельныя нейкія спаборніцтвы... І на трасе ўжо ідзе выпрабоўванне самога сябе і тэхнікі. А калі ў чалавеку прачынаецца азарт, то ён імкнецца дасягнуць вынікаў, паказаць сябе.

— Удаецца пранікнуцца мясцовай экзотыкай?

— Мы праехалі Чылі і Аргенціну. Маршруты змяняюцца — і краявіды змяняюцца. Уявіце, скалы сіне-зялёна-чырвоныя, пясок, дзюны — відовішчы чароўныя. Пустыня не надта прыгожая, а вось дзюны — проста нешта неверагоднае. Іх памер дасягае вышыні дваццаціпавярховага дома! На кожным «Дакары» маршрут праходзіць праз знакаміты спуск з Атакамы да акіяна працягласцю недзе кіламетра паўтара. На гэты раз я падымаўся ў тое месца пешшу. Спатрэбілася тры гадзіны для здзяйснення задумы. Здаецца, фініш блізка, а потым аказваецца, што ты толькі палову шляху пераадолеў. Затое відовішча, якое адкрываецца пасля пад'ёму, вартае гэтых высілкаў.

— Што прывозіце сабе і сябрам з такіх камандзіровак у якасці сувеніраў?

— Відэа і фотаматэрыял перш за ўсё. У мяне фатаграфія — хобі. У каманд перад апошнім этапам ёсць традыцыя збірацца ў біваку: размаўляць, абменьвацца майкамі — для іх гэта сувеніры. А ў нас такой магчымасці няма, таму запасаемся мясцовымі. У Аргенціне культ ялавічыны, таму там папулярныя скураныя вырабы, а яшчэ чай і віно. На мяжы з Чылі ў мясцовых плямёнаў можна набыць сувеніры з кавалкаў каменю, на якім размяшчаюцца малюнкі. Вось гэта вязём дадому.

— Лёгка перастройваецеся на звычайны лад пасля вяртання?

— На «Дакары» настолькі дынамічнае жыццё, што і пасля прыезду дадому не адпачываем. Безумоўна, у Мінску бег часу крыху запаволены, але ты вяртаешся з камандзіроўкі і павінен разгорнута пра ўсё расказаць. Напрыклад, цяпер рыхтую фільм для праграмы «Дыханне планеты». Матэрыялу шмат, і хочацца пра розныя цікавыя моманты і рэчы распавесці. Але ахапіць неабсяжнае не атрымліваецца пры ўсім жаданні.

Алена ДРАПКО.

З КАЛАЎРОТАМ У КАПТУРЫ НА ЦВІНТАРЫ

Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або http://3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Папярэдне ж праверыць сваё веданне роднай мовы можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:

Пампава́ць — падаваць, здабываць што-небудзь помпай (па-руску — качать). Дарэчы, сёння карыстальнікі інтэрнэту актыўна ўжываюць слова пампаваць у значэнні: качаць што-небудзь з інтэрнэту.

Схамяну́цца — раптам успомніць пра што-небудзь. У нямецкай мове schamen (шамен) ужываецца са значэннем «саромецца», а ў нас — успомніць.

Імпэ́т — парывістасць, імклівасць. У Ніла Гілевіча чытаем:

Зірні на ручайкі — з якім імпэтам
Яны свідруюць снег, туманам сточаны!

Калаўро́т — прыстасаванне для ручнога прадзення кудзелі. Нашы продкі маглі б сказаць: «У левым куце на лаве стаіць прасніца з кудзеляй, пры ёй на падлозе — калаўрот».

Цвінта́р — царкоўны двор ці агароджанае месца пры царкве. Слова прыйшло з польскай мовы.

Капту́р — галаўны ўбор, які завязваецца пад падбародкам.

Мала кашы еў — недастаткова вопытны, каб брацца за сур'ёзную справу. Па-беларуску яшчэ скажуць: казы смаленай не бачыў. Па-руску: «молодо-зелено». У жартаўніка Паўла Шыбута чытаем: «Гаворыце, што ён яшчэ мала кашы з'еў? Затое колькі віна выпіў!..»

Пасаліўшы можна есці — ні добра(-ы), ні дрэнна(-ы), пасрэдна(-ы). Беларускі аналаг: ні тое ні сёе, ні два ні паўтара. Рускі — «ни рыба ни мясо». Вось як трапна аднойчы выказаўся Кандрат Крапіва:

Новых п'ес у вас не густа,
Чым мая вам не да густу?
Калі справа йдзе аб змесце,
Пасаліўшы можна есці...

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» кожную суботу ў 11.10—11.25.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Тэлесеткі

«ПЕРШАЕ МУЖЧЫНСКАЕ» НАБЫЛО НОВЫ ТВАР

Праекты, прысвечаныя пошуку і падтрымцы маладых перспектыўных выканаўцаў, даўно ўжо зрабіліся неад'емнай часткай эфіраў тэлеканала АНТ. Цяпер да гэтага руху далучылася і аднайменная радыёстанцыя, якая прапанавала спеваку Аляксею Гросу новы фармат супрацоўніцтва — стаць у 2015 годзе жывым увасабленнем PR-кампаніі «Радыё АНТ», што пазіцыянуе сябе таксама як «Першае мужчынскае радыё».

Як адзначае кіраўніцтва радыёстанцыі, падобны вопыт абяцае стаць цікавым і для вяшчальніка, і для самога артыста: «Аляксей дынамічны, абаяльны, лёгкі на пад'ём і, на нашу думку, здольны дабавіць энергетыкі не толькі PR-кампаніі, але і эфіру «Радыё АНТ» у цэлым». Першы тэлевізійны праморолік, пабудаваны на кантрасце стыльных чорна-белых здымак і сонечнага аранжавага колеру і заклікае аўдыторыю ўзгадаць пра самыя яркія моманты ў жыцці кожнага чалавека, ужо з'явіўся ў эфіры. Надалей, як абяцае творчая каманда радыё і тэлебачання, будзе яшчэ шмат сюрпрызаў — і не толькі ў Мінску і Наваполацку, дзе вяшчае радыёстанцыя.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

■

ПАНЯДЗЕЛАК, 9 ЛЮТАГА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.45 Зона Х.
9.10 Галоўны эфір.
10.05 Клуб рэдактараў.
10.45 «Зорнае жыццё». «Асуджаныя на адзіноту».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.50 Камедыя «Кадрыля».
13.40, 15.50 Меладрама «Каханне як няшчасны выпадак». 1-я і 2-я серыі.

15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
17.35 Беларуская часінка.
19.20 Арэна.
20.00 Форум.
21.00 Панарама.
21.45 Серыял «След».
23.25 Актуальнае інтэрв'ю.
0.15 Дзень спорту.
0.30 Меладрама «Красуня».

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 10.05, 21.20 Тэлебарометр.
9.05, 16.40 Баявік «Кулінар».
10.35 «Зразумець і абясшкодзіць».
11.15 М/с «Аватар. Легенда пра Аанга».
12.45 Баявік «Апошні кінагерой».
15.00 Ікра.
15.35 «Comedy Батл». Без межаў».
16.35, 19.25 Хачу ў тэлевізар!
17.50, 0.05 Серыял «Каханне на раёне».
18.50 Серыял «Інтэрны».
19.55 Серыял «Фізрук».
20.45 Рэальны свет.
21.25 КЕНО.
21.30 Дэтэктыў «Падмані мяне».
23.15 Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны».

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 17.30 «Дыя@блог Р.S.».
8.25, 15.20 «Размаўляем па-беларуску».
8.30 «Сабор Парыжскай Багародзіцы». Драма.
10.25 «Культпрасвет».
11.00 «Гутаперчавы хлопчык». Драма.
12.15 «Маладая гвардыя». Драма. 1-я і 2-я серыі.
14.55 «Камертон». Протаіерэй, кампазітар Андрэй Бандарэнка.
15.30 «Завяшчанне слуцкай княгіні». Дак. фільм.
15.55 «Калі нараджаўся Новы свет...». Пісьменнік Максім Лужанін.
16.35 «Пейзажы скрозь час». Тэрнер у гавані Анфлер.
17.00 «Гвазд зік». Драма.
18.00 «Шасцёра вандруюць па свеце». Фільм-казка.
19.05 «Вялікая сям'я». Меладрама.
20.45 «Калыханка».
21.05 Хіт парад. «Сто песень для Беларусі».
21.55 «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
22.20 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
22.50 «Подых струн». Музычная праграма. Госці: Яўген і Любоў Галат.

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 3.00 PRO спорт. Навіны.
8.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Вест Хэм» — «Манчэстэр Юнайтэд».
9.50 Біятлон. Этап Кубка свету. Нове-Места. Гонка пераследу. Жанчыны.
10.45 Баскетбол. НБА. «Кліўленд» — «Лейкерс».
12.35 Хакей. МХЛ. «Дынама-Шыннік» — «Рускія Віцязі».
14.25 Біятлон. Этап Кубка свету. Нове-Места. Гонка пераследу. Мужчыны.
15.15 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Бернлі» — «Вест Бромвіч».
17.10 Баскетбол. НБА. «Нью-Арлеан» — «Чыкага».
18.55 Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Трактар» (Чалябінск).
21.30 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. ВЭФ — «Цмокі-Мінск».
23.10 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
0.05 Змяшаныя адзінаборствы. Fight Nights.
2.10 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.00 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.10, 16.15 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 «Адваротны адлік. «Азарычы. Ахвяры «Эскулапа».
19.00 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 «Справа прынцыпу».
22.15 Драма «1+1».
0.15 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.45 «Вялікае снеданне».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!».
13.50 «Вялікі горад».
14.25 «Такі лёс».
15.10 «Ежа багоў».
15.50 «Іншая краіна». «Аб'яднаныя Арабскія Эміраты: не нафтай адзінай».
16.50 Серыял «Вовачка».
18.30 «Дакументальны праект»: «Дакрануцца да цуду».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Ваенная тайна».
23.00 «Тыдзень спорту».
23.30 Маст. фільм «Горад жыцця і смерці».
1.40 Серыял «Халасцякі». Заключныя серыі.

МІР

6.00 "180 хвілін».
9.00 "Беларусь сёння».
9.30, 1.25 Маст. фільм «Калыханка для мужчын».
10.50 «Любімыя акцёры».
11.20 Маст. фільм «Уцёкі з Новага жыцця».
13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 4.10 Серыял «Дарогі Індыі».
15.05, 3.10 Дак. серыял «У свеце ежы».
16.25, 0.35 Ток-шоу «Слова за слова».
17.20 Серыял «Шалёны анёл».
19.25 Маст. фільм «Небяспечная камбінацыя».

21.10 Серыял «Гурт «Зэта».
0.25 Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Карціна свету».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Уся Расія».
11.50 «Ракавыя лічбы. Нумералогія».
12.50 «Пакой смеху».
13.50, 16.50, 19.50, 23.40 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.40 «Мая планета».
17.10 «Асаблівы выпадак».
18.00 Серыял «Варажба пры свечках».
18.55 Серыял «Пакуль станіца спіць».
20.55 «Прамы эфір».
22.15, 23.50 Серыял «Даруй мне, мама».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.05 «Справа ўрачоў».
9.00, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
12.00 «Суд прысяжных».
13.15 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.15 «Ядзім дома».
14.50, 22.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
15.10 «Пракурорская праверка».
16.20 Серыял «Святло і цень маяка».
18.00 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
19.45, 23.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
22.45 «Анатомія дня».
0.25 Серыял «Пятніцкі».

8 КАНАЛ

7.00, 13.35, 19.50, 20.55, 23.45 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30 «Сёння клюе».
8.00, 19.55 Серыял «Краса нацыі».
8.45 «Кінаблакнот».
9.00 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».
10.00 Камедыя «Пол. Сакрэтны матэрыяльчык».
11.50 Трылер «Трохвугольнік».
13.40 Серыял «Чарцяня».
15.15, 19.35 «Хатняя крама».
16.30 «Золата маўчання». Our Gang «Пажарнікі».
17.00 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме».
18.30 Серыял «Барвовае поле».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Драма «Ананім».
23.15 Серыял «Прыгарад».
23.50 «Хобі TV».

ВТВ

6.00, 4.00 "PLAY".
7.30 М/ф «Смяшарыкі».
8.00, 17.00, 0.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30 Серыял «Вароніны».
9.00 «Я падаю на развод».
10.00, 19.00 Серыял «Анжаліка».
11.00, 18.00 Серыял «Кухня».
12.00 Камедыя «Пацучыныя скачкі».
14.10, 23.10 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.30, 17.30 «Лаві момант».
15.00 Серыял «90210: Новае пакаленне».
16.00, 3.00 «Маё вяселле лепшае!».
20.00 Серыял «Апошні з Магікян 3».
21.10 Меладрама «Татулі 2».
0.00 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «Зачараваныя».

КУЛЬТУРА

7.00 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.00, 23.40 Навіны культуры.
10.15 «Наглядальнік».
11.15 Маст. фільм «Забягалаўка».
12.40 Дак. фільм «Філолаг. Мікалай Лібан».
13.10 «Лінія жыцця». Вераніка Доліна.
14.05, 1.40 Серыял «Пецярбургскія тайны».
15.10 «А. Пушкін. «Яўгеній Анегін».
15.35 100 гадоў з дня нараджэння Барыса Андрэева. Маст. фільм «Два байцы».
16.50 Дак. фільм «Барыс Андрэеў. У нас таленту шмат...».
17.35, 1.35 Дак. фільм «Эрнэст Рэзерфорд».
17.45 Іаганес Брамс. Выбранае. Сімфонія № 4.
18.30 Да 125-годдзя з дня нараджэння паэта. «Пастэрнак і іншыя... Ганна Ахматава».
19.15 Галоўная роля.
19.30 «Саці. Нясумная класіка...».
20.10 «Правілы жыцця».
20.40 «Добрай ночы, малыя!».
20.50 «Астравы». Іван ІванОў-Вано.
21.30 «Тым часам».
22.15 Дак. фільм «Геном неандэртальцаў».
23.10 Дак. серыял «Адлюстраваны час».
0.00 Дак. фільм «Іван Жданаў. Дзевяць вершаў».
0.55 Дак. камера. «Паэзія і кіно».
2.40 Э. Грыг. Сюіта для аркестра з музыкі да драмы Ібсена «Пер Гюнт».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 12.00, 0.00 Творчы вечар паэта М. Рабініна. 1991 год.
7.00 «Ранішняя пошта». 1985 год.
7.35 «Вакол смеху». 1984 год.
9.00 Фільм-канцэрт «Спявае Аляксандр Сяроў». 1988 год.
9.35 Дак. фільм «Нядзельныя дзеці».
10.00, 16.00 Маст. фільм «Даруй нам, сад».

11.10 «Шэсць песень на біс». 1993 год.
12.50 «Вясёлая моладзь». 1983 год.
14.25 Фільм-канцэрт «Валерый Лявонцьеў. Дай мне пайсці з табой...». 1993 год.
15.40 Дак. фільм «Зімовым днём у Іркуцку».
17.20 «Музыка ў эфіры». «Галіна Вішнеўская. Пра каханне». 1993 год.
18.00 «Да 16 і старэйшым». 1992 год.
18.45 «Сябруюць дзеці ўсёй зямлі». Канцэрт Вялікага дзіцячага хору ЦТ і ВР п/у В. Папова. 1986 год.
19.20 Фільм-спектакль «Антоній і Клеапатра». 1-я серыя. 1980 год.
20.35 Дак. фільм «Трэцяя вяршыня Смятанінай».
21.00, 3.00 Праграма «Час».
22.00 «Народжаныя ў СССР».
23.00 «Песня-87». 1-я частка.
0.50 Канцэрт замежнай эстрады.
1.15 «Тэмп». 1992 год.
1.50 Тэлефільм «Следства вядуць знатакі».
4.00 «Колба часу».
5.00 Праграма «Погляд». 1988 год.

EUROSPORT

10.30 14.00 Горныя лыжы. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
11.00, 14.30, 0.00 Горныя лыжы. Чэмпіянат свету.
11.30, 15.00 Горныя лыжы.
11.45, 15.15, 1.00 Скачкі на лыжах з трамплінаў. Кубак свету.
12.30, 2.00 Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
13.15, 2.45 Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
16.00 Снукер. Прафесійны снукерны турнір. Фінал.
17.30 Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый. Фінал.
19.00 Футбол. Еўрагалы.
19.45, 23.15 Горныя лыжы. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
21.30, 23.00 WATTS.
22.00 Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.00, 16.15, 17.30, 22.00, 3.10 Серыял «Былыя».
6.45 Камедыя «Баскетбольная ліханаманка».
8.25 Камедыя «Востраў Нім».
10.45 Камедыя «Мой лепшы палюбоўнік».
12.30 Камедыя «Зорка сцэны».
14.00, 14.50, 15.30 «Камедыянты (Шоу)».
14.25, 15.15, 16.00, 16.55, 20.00, 21.40, 22.50, 0.50, 5.40 Скетчком «Паміж намі».
18.20 Камедыя «Выпадковы муж».
20.20 Камедыя «Трэнер па адносінах».
22.40 «Камедыянты. Лепшае».
23.10 Камедыя «Вар'яцка закаханы».
1.15 Камедыя «Двое — гэта занадта».
4.00 Камедыя «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам».

ТБ3

6.00 М/ф.
8.00, 18.50, 2.00 «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
9.45, 4.25 «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
11.30, 17.55 «Справа Астахава». Дак. серыял.
12.15 «Біццё сэрца». Маст. фільм.
15.30, 22.40, 3.35 «Зорныя гісторыі».
16.30 «Простыя складанасці».
17.00 «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
20.45 «Ганна Герман». Серыял. Заключная серыя.
21.50, 1.15 «Катоўскі». Серыял.
23.35 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
0.20 «Часова даступны».
5.15 «Аўрора». Серыял.

ТБ1000

6.45, 14.30 Трылер «Стэлс».
9.00 Трылер «Чырвоны дракон».
11.10 Драма «10 крокаў да поспеху».
12.40 Баявік «Машына часу».
16.30, 4.00 Камедыя «Вяселле майго лепшага сябра».
20.00 Драма «Вельмі добрыя дзяўчынкі».
21.45 Драма «Машына Джэйн Мэнсфілд».
0.00 Драма «Лінкальн для адваката».
2.00 Баявік «Галівудскія копы».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Камедыя «Назад — да шчасця, або Хто знойдзе Сінюю птушку».
8.10 Камедыя «Ёлкі 3».
9.50 Камедыя «Здрасьце, я ваш тата!».
11.30 Меладрама «Восеньскія клопаты».

13.00 Дэтэктыў «Смерць пад ветразем».
15.10 Камедыя «Джэнтльмены, удачы!».
17.00 Баявік «Спіраль».
18.40 Трагікамедыя «Белы маўр, або Інтымныя гісторыі пра маіх суседзяў».
20.20 Камедыя «З новым годам, мамы!».
21.45 Камедыя «Джунглі».
23.10 Камедыя «Палярны рэйс».
0.50 Баявік «Бой з ценем».
3.00 Трылер «Цёмны свет».
4.45 Драма «Салодкая жанчына».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Інжынерныя ідэі.
6.45, 12.40, 18.45, 22.55, 2.40, 5.40 Зрабі або памры.
7.30, 13.25, 19.10, 22.30, 2.15, 5.15 Навуковыя недарэчнасці.
7.55, 13.50 Кіраванне натоўпам.
8.15, 21.45, 1.30, 4.30 Расследаванні авіякатастроф.
9.40, 14.10, 17.15, 19.30 Ракавая стыхія.
10.25, 14.55, 20.15 Дагістарычныя монстры Гітлера.
11.10 Машыны: разабраць і прадаць.
11.55 Золата Юкана.
15.45 Няўлоўная кошка.
16.30 Дзікая прырода Расіі.
18.00, 3.00 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
21.00, 0.45, 3.45 Міжнародны аэрапорт Дубай.
23.15 Турэмныя цяжкасці.
0.00 Паранармальнае.

DISCOVERY

8.00, 10.55, 15.55, 21.20 Як гэта зроблена?
8.25, 10.30, 15.30, 21.45 Як гэта ўстроена?
8.50, 11.20 Разбуральнікі легенд.
9.40, 13.50 У пагоні за класікай.
12.10, 18.00 Каралі аўкцыёнаў.
13.00, 22.10, 7.05 Голыя і напалоханыя.
14.40, 6.05 Што было далей?
16.20, 4.25 Хуткія і гучныя.
17.10, 5.15 Махінатары вяртаюцца.
18.50 Мяцежнікі ледзянога возера.
19.40 Не спрабуйце паўтарыць.
20.30 Эфект Карбанара.
23.00 Востраў з Беарам Грылсам.
23.50 Гульня на жыццё.
0.40, 3.35 Паляўнічыя на рэліквіі.
1.30 Top Gear.
2.20 Маланкавыя катастрофы.
2.45 Сапраўдныя аферысты.

АЎТОРАК, 10 ЛЮТАГА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.25 Зона Х.
9.15, 21.45 Серыял «След».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05, 20.00 Серыял «Выходжу цябе шукаць 2».
12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».
13.05 Дзень у вялікім горадзе.
14.00 Серыял «Адвакатэсы».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 0.30 Серыял «Сваты 6».
17.35 Беларуская часінка.
19.20, 23.45 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
0.15 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.20 Тэлебарометр.
9.05, 16.40 Баявік «Кулінар».
10.10 «Fitnews».
10.45, 21.35 Дэтэктыў «Падмані мяне».
12.40 Анімацыйны фільм «Ледніковы перыяд 4: Кантынентальны дрэйф».
14.05, 18.50 Серыял «Інтэрны».
14.40, 19.50 Серыял «Фізрук».
15.35 «Comedy woman».
17.50, 0.10 Серыял «Каханне на раёне».
20.50 Рэальны свет.
21.25 Спортлато 6 з 49.
21.30 КЕНО.
23.20 Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны».

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 15.45, 23.40 «Галасы з мінулага». 125 гадоў з дня нараджэння рускага паэта Барыса Пастэрнака.
8.05, 16.50 Серыял «Робін з Шэрвуда».
9.00 «Вялікая сям'я». Меладрама.
10.35, 17.40 «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
11.05 «Подых струн». Музычная праграма. Госці: Яўген і Любоў Галат.
11.45 «Сэрца і матор Міхаіла Высоцкага». Дак. фільм.
12.10, 23.15 «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага артыста СССР і Беларусі Віктара Тарасава.
12.35 Творчы вечар народнага артыста СССР Уладзіміра Зельдзіна.
13.50 «Свінарка і пастух». Камедыя.

15.15 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
15.50 «Пакуль гарыць свечка...». Вершы Барыса Пастэрнака ў перакладзе на беларускую мову.
16.20 «Гваздзік». Драма.
18.10 «Зімовыя мроі». Канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча.
19.10 «Апошняя дарога». Драма.
20.45 Калыханка.
21.05, 22.25 «Імперыя. Пачатак». Драма. Фільм першы «Царэвіч Аляксей».
22.00 «Дыя@блог». «Пра мову».

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 2.45 PRO спорт. Навіны.
7.45 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
8.40 Біятлон. Этап Кубка свету. Нове-Места. Супермікс.
10.10 Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Трактар» (Чалябінск).
12.05 Біятлон. Этап Кубка свету. Нове-Места. Змяшаная эстафета.
13.35 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. ВЭФ — «Цмокі-Мінск».
15.10 Біятлон. Этап Кубка свету. Нове-Места. Спрынт. Мужчыны.
16.40 Баскетбол. НБА. «Нью-Арлеан» — «Чыкага».
18.30 Гандбол. SEHA-ліга. «Раднічкі» — «БГК імя Мяшкова».
19.55 Біятлон. Этап Кубка свету. Нове-Места. Спрынт. Жанчыны.
21.30 Спорт-кадр.
22.00 Еўрапейскі покерны тур.
22.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Тотэнхэм».
0.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Лестэр».

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.10, 16.15 «Час пакажа».
18.20 Серыял «Аднакласнікі».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Тэст на цяжарнасць».
23.05 Серыял «Адналюбы».
0.05 «Вячэрні Ургант».
0.40 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 Маст. фільм «Каханне — гэта для дваіх».
10.15 «Дарагая перадача».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!».
13.50 «Цэнтральны рэгіён».
14.20 «Наша справа».
14.30 «Мінск і мінчане».
15.00 «Добры дзень, доктар».
15.35 «Ежа багоў».
16.50 Серыял «Вовачка».
18.30 «Нам і не снілася»: «Каварства лёсу». 1-я частка.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Маст. фільм «Самаволка».
22.10 «Глядзець усім!».
23.00 «Разумней не прыдумаеш». «Сезон адкрыццяў».
0.00 «Аўтапанарама».
0.20 «На тым жа месцы ў той жа час».
1.25 Серыял «Фірменная гісторыя».

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Любімыя акцёры».
9.30, 1.30 Маст. фільм «Свінарка і пастух».
11.10 Маст. фільм «Небяспечная камбінацыя».
13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 4.05 Серыял «Дарогі Індыі».
15.05, 3.10 Дак. серыял «Шлюб без ахвяраў».
16.25, 0.35 Ток-шоу «Слова за слова».
17.20 Серыял «Шалёны анёл».
19.25 Маст. фільм «Любімая дачка таты Карла».

21.10 Серыял «Гурт «Зэта».
0.25 Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Уся Расія».
11.50 «Прашу Вашай рукі і генаў».
12.50 Серыял «Каменская».
13.50, 16.50, 19.50, 23.40 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.40 «Уладзімір Зельдзін. Кумір стагоддзя».
17.10 «Асаблівы выпадак».
18.00 Серыял «Варажба пры свечках».
18.55 Серыял «Пакуль станіца спіць».
20.55 «Прамы эфір».
22.15, 23.50 Серыял «Даруй мне, мама».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.05 «Справа ўрачоў».
9.00, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
12.00 «Суд прысяжных».
13.15 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.15 «Справа густу».
14.45, 22.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
15.10 «Пракурорская праверка».
16.20 Серыял «Святло і цень маяка».
18.00 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
19.45, 23.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
22.45 «Анатомія дня».
0.25 Серыял «Пятніцкі».

8 КАНАЛ

7.00, 13.35, 19.50, 20.55, 23.40 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30, 19.55 Серыял «Краса нацыі».
8.15, 18.30 Серыял «Барвовае поле».
9.15, 19.35 «Хатняя крама».
9.35 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».
10.30, 23.45 «Хобі TV».
11.05 Камедыя «Клетка для птушак».
13.05 «Кінаблакнот».
13.40 Серыял «Чарцяня».
15.15, 19.35 «Хатняя крама».
16.30 «Золата маўчання». Арбакл «Адважнае шчаня Фаці».
17.00 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «Даведнік па краінах і кантынентах».
21.10 Драма «Асноўны інстынкт».
23.15 Серыял «Прыгарад».

ВТВ

6.00, 4.00 «PLAY».
7.30 М/ф «Смяшарыкі».
8.00, 17.00, 0.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30 Серыял «Вароніны».
9.00, 20.00 Серыял «Апошні з Магікян 3».
10.00, 19.00 Серыял «Анжаліка».
11.00, 18.00 Серыял «Кухня».
12.00 Меладрама «Татулі 2».
14.00, 23.00, 2.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.30, 17.30 «Лаві момант».
15.00 Серыял «90210: Новае пакаленне».
16.00, 3.00 «Маё вяселле лепшае!».
21.10 Меладрама «Законы прывабнасці».

0.00 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «Зачараваныя».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.00, 23.40 Навіны культуры.
10.15, 22.40 Юбілей Уладзіміра Зельдзіна. «Наглядальнік».
11.15, 0.00 Ілюзіён. Святыя пачвары. Маст. фільм «Дракула».
12.40 «Эрмітаж-250».
13.10 Дак. фільм «Геном неандэртальцаў».
14.05, 1.55 Серыял «Пецярбургскія тайны».
15.10 «А. Пушкін. «Яўгеній Анегін».
15.35 «100 гадоў Уладзіміру Зельдзіну. Маст. Фільм «Настаўнік танцаў».
17.55, 1.20 Іаганес Брамс. Выбранае. Сімфонія № 3.
18.30 125 гадоў з дня нараджэння паэта. «Пастэрнак і іншыя... Міхаіл Булгакаў».
19.15 Галоўная роля.
19.30 Штучны адбор.
20.10 «100 гадоў Уладзіміру Зельдзіну. «Перагортваючы жыццё».
21.15 Маст. фільм «Свінарка і пастух».
2.50 Н. Рота. «Прагулка з Феліні».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 0.00 Творчы вечар паэта М. Рабініна. 1991 год.
6.50 «Вясёлая моладзь». 1983.
7.55 «Пакуль усе дома». У гасцях у Анатоля Рамашына. 1993 год.
8.25 Фільм-канцэрт «Валерый Лявонцьеў. Дай мне пайсці з табой...». 1993 год.
9.40 Дак. фільм «Зімовым днём у Іркуцку».
10.00, 4.00 Маст. фільм «Даруй нам, сад».
11.20 «Музыка ў эфіры». «Галіна Вішнеўская. Пра каханне». 1993 год.
12.00 «Да 16 і старэйшым». 1992 год.
12.45 «Сябруюць дзеці ўсёй зямлі». Канцэрт Вялікага дзіцячага хору ЦТ і ВР п/у В. Папова. 1986 год.
13.20, 19.20 Фільм-спектакль «Антоній і Клеапатра». 1980 год.
14.35 Дак. фільм «Трэцяя вяршыня Смятанінай».
15.00, 21.00 Праграма «Час».
16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
17.00, 23.00 «Песня-87».
18.00 Дак. фільм «Мы — маладая гвардыя. Свята юнацтва». Да 50-годдзя ВЛКСМ.
18.30 «50/50». «Кальварыя-шоу». 1992 год.
20.40 Канцэрт замежнай эстрады.
1.00 «Ранішняя пошта». 1985 год.
1.35 «Вакол смеху». 1984 год.
3.00 Фільм-канцэрт «Спявае Аляксандр Сяроў». 1988 год.
3.35 Дак. фільм «Нядзельныя дзеці». 1989 год.
5.10 «Шэсць песень на біс». 1993 год.

EUROSPORT

10.30, 14.00 Горныя лыжы. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
11.00, 14.30, 23.15 Горныя лыжы. Чэмпіянат свету.
11.30, 15.00 Горныя лыжы.
11.45, 17.45 Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
12.30, 17.00 Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
13.15, 18.30, 2.15 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
15.15, 19.30 Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый.
16.15 Футбол. Еўрагалы.
20.30 Снукер. Прафесійны снукерны турнір. Фінал.
22.00 Бокс. Чэмпіянат свету СБА. А. Абрахам (Германія) — P. Smith (Злучанае каралеўства).
1.45 Ралі. За кулісамі ERC.

КОМЕДИЯ

6.00, 10.00, 16.15, 17.30, 22.00, 3.10 Серыял «Былыя».
6.45 Камедыя «Востраў Нім».
8.25 Камедыя «Зорка сцэны».
10.40 Камедыя «Парода бульдог».
12.10, 14.25, 15.15, 16.00, 16.55, 20.00, 21.40, 22.50, 0.40 Скетчком «Паміж намі».
12.30 Камедыя «Выпадковы муж».
14.00, 14.50, 15.30 «Камедыянты (Шоу)».
18.20 Камедыя «Трэнер па адносінах».
20.20 Камедыя «Прыдуркі».
22.40 «Камедыянты. Лепшае».
23.10 Камедыя «Гаспадар у доме».
1.15 Камедыя «Мой лепшы палюбоўнік».
4.00 Камедыя «Двое — гэта занадта».

ТБ3

6.00 М/ф.
7.30 «Доктар І...».
8.00, 18.50, 1.40 «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
9.40, 3.40 «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
11.25, 17.55 «Справа Астахава». Дак. серыял.
12.20, 17.00 «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
13.15 «Ганна Герман». Серыял. Заключная серыя.
14.15 «Простыя складанасці».
14.45, 0.10 «Каменская». Серыял.
15.35, 22.30 «Зорныя гісторыі».
16.30, 3.10 «Нераскрытыя таямніцы».
20.40 «Пошукі доказаў». Серыял.
21.40, 0.55 «Катоўскі». Серыял.
23.25 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
5.15 «Аўрора». Серыял.

ТБ1000

6.00 Трылер «Крумкач».
7.50 Баявік «Галівудскія копы».
9.50 Камедыя «Я нармальна супер гуд».
11.35, 04.35 Драма «Мы. Верым у каханне».
13.30 Камедыя «Вяселле майго лепшага сябра».
16.45 Драма «Касмопаліс».
18.30 Драма «Гульні страсці».
20.00 Драма «Язмін».
21.45 Фантастыка «Паралельныя светы».
23.30 Трылер «Паляўнічы на забойцаў».
1.05 Баявік «Адзінаццаць сяброў Оўшэна».
3.05 Камедыя «Мадлен».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Камедыя «Іван Броўкін на цаліне».
8.00 Трагікамедыя «Вар'яцкая дапамога».
10.00 Камедыя «З новым годам, мамы!».
11.30 Фільм-казка «Прынцэса на гарошыне».

13.00 Драма «Узломшчык».
14.30 Камедыя «Вось гэта каханне!».
16.10 М/ф «Карлік Нос».
17.30 Прыгоды «Грэчаскія канікулы».
19.00 Камедыя «Са мною вось што адбываецца».
20.20 Драма «Неба паўшых».
22.20 Драма «Чэмпіёны».
0.00 Баявік «Бой з ценем: Рэванш».
2.20 Трагікамедыя «Кококо».
3.50 Мюзікл «Востраў загінулых караблёў».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Інжынерныя ідэі.
6.45, 12.40, 18.45, 22.55, 2.40, 5.40 Зрабі або памры.
7.30, 13.25, 19.10, 21.45, 1.30, 4.30 Навуковыя недарэчнасці.
7.55, 13.50 Кіраванне натоўпам.
8.15, 17.15 Ракавая стыхія.
8.55 Дагістарычныя монстры Гітлера.
9.40, 14.10, 19.30 Міжнародны аэрапорт Дубай.
10.25, 14.55, 20.15 Расследаванні авіякатастроф.
11.10 Машыны: разабраць і прадаць.
11.55 Золата Юкана.
15.45 Узыходжанне чорнага ваўка.
16.30 Дзікая прырода Расіі.
18.00, 3.00 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
21.00, 0.45, 3.45 Папулярная навука.
23.15 Турэмныя цяжкасці.
0.00 Паранармальнае.

DISCOVERY

8.00, 10.55, 15.55, 21.20 Як гэта зроблена?
8.25, 10.30, 15.30, 21.45 Як гэта ўстроена?
8.50, 11.20 Што было далей?
9.40, 13.50, 22.10 Хуткія і гучныя.
12.10, 18.00 Паляўнічыя на рэліквіі.
13.00, 7.05 Як выжыць на незаселеным востраве.
14.40, 6.05 Скрыўленне часу.
16.20, 4.25 Класіка з Паўднёвага пляжа.
17.10, 5.15 Махінатары вяртаюцца.
18.50 Гульня на выццё.
19.40 Востраў з Беарам Грылсам.
20.30 Голыя і напалоханыя.
23.00 Мяцежны гараж.
23.50 Мотабітва.
0.40, 3.35 Бітвы за кантэйнеры.
1.30 Top Gear.
2.20 Маланкавыя катастрофы.
2.45 Сапраўдныя аферысты.

■ «Еўрабачанне-2015»

АРТЫСТАЎ ПА ВЯСНЕ ПАДЛІЧАЦЬ

Са сваімі прадстаўнікамі на юбілейным 60-м міжнародным конкурсе песні, які пройдзе ў маі ў аўстрыйскай сталіцы, вызначыліся пазаўчора Чэхія і Швейцарыя. Такім чынам, з 39 краін-удзельніц «Еўрабачання» больш як трэць ужо распачалі падрыхтоўку абраных артыстаў і калектываў да конкурсу, яшчэ як мінімум 13 краін зробяць гэта цягам лютага. Імёны ўсіх удзельнікаў мусяць быць агучаны да сярэдзіны сакавіка, калі адбудуцца сустрэча кіраўнікоў дэлегацый і прэзентацыя поўнага камплекту ўсіх конкурсных промаматэрыялаў.

Што да нашых найбліжэйшых суседзяў, то ў Расіі музычнага дэлегата на конкурс сёлета абірае Першы канал: праўда, пакуль невядома, у фармаце закрытага адбору ці традыцыйнага праслухоўвання кандыдатаў. Украіна ж, нагадаем, ад удзелу ў «Еўрабачанні-2015» адмовілася з прычыны нестабільнай эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў краіне.

Тым часам прыхільнікі песеннага шоу рыхтуюцца «лавіць» у продажы білеты на генеральныя рэпетыцыі, паўфіналы і фінал конкурсу. Першая партыя квіткоў коштам ад 14 да 390 еўра ў снежні мінулага года была раскуплена літаральна за 20 хвілін, другая, якая паступіла ў продаж напрыканцы студзеня, таксама разышлася ў аматараў як гарачыя піражкі.

Арганізатары пакрысе раскрываюць усё новыя падрабязнасці 60-га «Еўрабачання». Так, ужо вядома, што вядучымі конкурсу, які адбудзецца сёлета пад дэвізам «Узводзячы масты», стануць тры жанчыны — папулярныя аўстрыйскія тэлевядучыя і грамадскія дзеячы Мір'ям Вайксельбраўн, Аліс Тамлер і Арабела Кісбаўэр, а пераможца леташняга «Еўрабачання» Канчыта Вурст будзе сустракаць удзельнікаў у грын-рум. Шоу пройдзе з 19 па 23 мая на самым вялікім стадыёне Вены — «Вінер Штадтхале», а для афармлення сцэны арганізатары выкарыстаюць унікальную святлодыёдную канструкцыю з 1288 асобных светлавых слупоў, якія змогуць перадаваць тысячы розных адценняў колераў. Літаральна ўчора пачалася здымка відэапаштовак кожнай краіны для конкурсу — першымі гэта зробяць сумесна з арганізатарамі шоу тэлевізійнікі Сан-Марына.

Не так даўно адбылася і папярэдняя жараб'ёўка ўдзельнікаў конкурсу. Нагадаем, прадстаўнікі нашай краіны на «Еўрабачанні-2015», дуэт спевака Юзары і скрыпачкі Маймуны, выйдуць на сцэну ў другой частцы першага паўфінальнага канцэрта 19 мая. Кампанію, а разам з тым і канкурэнцыю ім складуць артысты з 15 краін: Албаніі, Арменіі, Бельгіі, Венгрыі, Грузіі, Грэцыі, Даніі, Македоніі, Малдовы, Нідэрландаў, Расіі, Румыніі, Сербіі, Фінляндыі і Эстоніі. Галасаваць у гэты дзень таксама будуць краіны «вялікай пяцёркі» заснавальнікаў шоу — Іспанія і Францыя — і краіна-гаспадыня конкурсу Аўстрыя. У другім паўфінале выступяць канкурсанты з 17 краін: Азербайджана, Ізраіля, Ірландыі, Ісландыі, Кіпра, Латвіі, Літвы, Мальты, Нарвегіі, Партугаліі, Польшчы, Сан-Марына, Славеніі, Чарнагорыі, Чэхіі, Швейцарыі і Швецыі, а галасаваць таксама будуць Германія, Італія і Вялікабрытанія. Канчатковы парадак выступлення ўдзельнікаў вызначаць у сакавіку прадзюсары шоу, дзеля таго каб зрабіць яго максімальна відовішчным і разнесці аднолькавыя па стыльстыцы нумары.

Беларускія ўдзельнікі, пакуль час яшчэ ёсць, запісваюць некалькі розных версій сваёй конкурснай песні «Time» і разглядаюць ідэі для здымак будучага кліпа (яны абяцаюць улічыць усе прапановы, у тым ліку і ад слухачоў).

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

■

СЕРАДА, 11 ЛЮТАГА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.15** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.45 Зона Х.
9.15, 21.45 Серыял «След».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05, 20.00 Серыял «Выходжу цябе шукаць 2».
12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».
13.05 Дзень у вялікім горадзе.
14.00 Серыял «Адвакатэсы».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 0.45 Серыял «Сваты 6».
17.35 Беларуская часінка.
19.20, 0.00 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
23.25 Актуальнае інтэрв'ю.
0.35 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.20 Тэлебарометр.
9.05, 16.45 Баявік «Кулінар».
10.05 Беларуская кухня.
10.35, 21.35 Дэтэктыў «Падмані мяне».
12.25 Анімацыйны фільм «Сезон палявання».
13.50, 18.50 Серыял «Інтэрны».
14.55 Серыял «Фізрук». Заключныя серыі.
15.55 Рэпарцёр.
17.50, 0.10 Серыял «Каханне на раёне».
20.50 Рэальны свет.
21.25 Спортлато 5 з 36.
21.30 КЕНО.
23.20 Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны».

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 16.30 Серыял «Робін з Шэрвуда».
8.50 «Апошняя дарога». Драма.
10.25, 17.20 «Дыя@блог». «Пра мову».
10.55 «Імперыя. Пачатак». Драма. Фільм першы «Царэвіч Аляксей».
12.40, 23.15 «Святло далёкай зоркі». Памяці заслужанай артысткі Беларусі Вольгі Шутавай.
13.05 «Цырк». Камедыя.
14.35 «Навукаманія». Стваляваныя клеткі.
15.00 «Наперад у мінулае».
15.30 «Размаўляем па-беларуску».
15.35 «Рэчавы доказ». Палаш Ізмайлава. Дак. фільм.
16.00 «Гваздзік». Драма.
17.50 Людвіг ван Бетховен. «Сімфонія № 9». Выконваюць: Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Беларусі, Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь.
19.00 «Паклонніца». Драма.

20.45 Калыханка.
21.05, 22.20 «Імперыя. Пачатак». Драма. Фільм другі «Царскае паляванне».
21.55 «Дыя@блог». «Пра прыгожае».

БЕЛАРУСЬ 5

6.05, 2.30 PRO спорт. Навіны.
6.35, 13.05 Баскетбол. НБА. «Лейкерс» — «Дэнвер».
8.45 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Тотэнхэм».
10.35 Спорт-кадр.
11.05 Козел пра футбол.
11.15 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Лестэр».
14.55 Формула-Е. Гран-пры Аргенціны.
16.00, 20.10 Тэніс. Турнір ВТА. Антверпен.
18.00 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Нёман» (Гродна).
22.05 Авертайм.
22.40 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Чэлсі» — «Эвертан».
0.40 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Сток Сіці» — «Манчэстэр Сіці».

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.10, 16.15 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 Серыял «Аднакласнікі».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Тэст на цяжарнасць».
23.05 Серыял «Адналюбы».
0.05 «Вячэрні Ургант».
0.40 Начныя навіны.

СТБ

6.50, 8.20 Серыял «Груз».
8.00, 10.00, 13.00 Сёння.
8.50 «Урачэбныя тайны плюс».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
11.05 «Паедзем, паядзім!».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.25 Серыял «Дазнаўца».
16.00 Дэтэктыў «Мядзведжая хватка».
17.40 «Выратавальнікі».
18.05 «Следства вялі...».
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
20.05 «Новыя рускія сенсацыі».
22.10 «Ты не паверыш!».
23.10 Маст. фільм «Гонар самурая».
0.50 «Мужчынская годнасць».

8 КАНАЛ

9.00, 15.25, 19.05, 21.05, 23.40 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
10.25 Серыял «Высакародная жанчына».
11.30 «Даведнік па краінах і кантынентах».
11.40 Прыгоды «Індзіяна Джонс. Апошні крыжовы паход».
13.40 Прыгоды «Зламаная страла».
15.30 «Хатняя крама».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Камедыя «Два стваллы».
18.20 Серыял «Месца злачынства Маямі».
19.10 Трылер «Выкуп».
20.50 «Вечарніца».
21.10 «Фэшн is my прафэшн».
21.20 Драма «Апакаліпсіс».

23.45 «Хобі TV».

ВТВ

6.00, 5.00 «PLAY».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Вароніны».
10.00, 2.00 «Турба міксер».
12.00 «Хатняя кухня».
12.30 Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».
15.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
15.30 Камедыя «Вельмі небяспечная штучка».
17.30 «Уральскія пельмені».
19.00 Серыял «Супер Макс».
20.30 Камедыя «Бобро поржаловать!».
22.45 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
23.30 Скетч-шоу «Валера-ТБ».
0.30 «Лаві момант».
1.00 «Нерэальная гісторыя».
1.30 «Людзі Хэ».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 Біблейскі сюжэт.
10.35 Маст. фільм «Дзядзькаў сон».
11.55 «Легенды сусветнага кіно». Лідзія Смірнова.
12.25 Вялікая сям'я. Аляксандр Панкратаў-Чорны.
13.20 Пернікавы домік. «Казачы касцюм».
13.50 Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны. Дак. серыял «Нефрантавыя нататкі».
14.15 Да 100-годдзя Уладзіміра Зельдзіна. «Тэатральны летапіс. Выбранае».
15.00 Хрустальны баль «Хрустальнай Турандот» у гонар Уладзіміра Зельдзіна.
16.25 Дак. фільм «Усць-Палуй».
16.55 Уладзімір Співакоў. Юбілейны канцэрт у Маскоўскім міжнародным Доме музыкі.
19.10 Маст. фільм «Кін-дза-дза!».
21.20 «Рамантыка раманса». Генадзь Гладкоў.
22.15 «Белая студыя».
22.55 Фільм-спектакль «Страсці па Федры ў чатырох снах Рамана Вікцюка».
23.40 Кіно на ўсе часы. Маст. фільм «Нарэшце каханне».
1.30 М/ф для дарослых «Містар Пронька».
1.55 Краіна птушак. Дак. фільм «Я бачыў улара».
2.40 «Сусветныя скарбы культуры».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Клуб падарожнікаў». 1983 год.
7.05 Канцэрт майстроў мастацтваў Азербайджанскай ССР. 1970 год.
7.25, 1.15 Тэлеспектакль «Мегрэ і чалавек на лаўцы». 1-я частка. 1973 год.
8.35 Фільм-канцэрт «Аркестр Поля Марыа». 1983 год.
9.00, 15.00, 3.00 Праграма «Час».
10.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
11.00, 5.00 «Песня-87».
12.00, 18.00 «У коле сяброў. Вас запрашае Эльдар Разанаў». 1986 год.
13.15 Фільм-канцэрт «Музычны круіз». 1994 год.
13.45 Тэлефільм «Следства вядуць знатакі».
16.00 «Колба часу».
17.00 Праграма «Погляд». 1989 год. 1-я частка.
19.00 «Ранішняя пошта». 1986 год.
19.40 «Вакол смеху». 1981 год.
21.00 «ТБ дыскатэка». 1986 год.
21.50 Маст. фільм «Адам жэніцца на Еве». 1-я серыя.
23.00 «Залаты дыск-90». Канцэрт з удзелам В. Дабрыніна. 1991 год. 1-я частка.
0.00 Дак. фільм «Красавік».
2.40 Канцэрт замежнай эстрады.

EUROSPORT

10.30 Горныя лыжы. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
11.15, 12.30 Санны спорт. Чэмпіянат свету.
12.00 Горныя лыжы.
12.15 WATTS.
13.00, 21.15 Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
14.30 Лыжныя гонкі. Кубак свету.
16.15, 21.45 Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
17.45, 22.30 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
19.45, 23.30 Горныя лыжы. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
1.15 Конны спорт. Ганконг Мастэрс.
2.15 Хакей. Універсіяда. Фінал.

КАМЕДЫЯ

6.00 Камедыя «Вар'яцка закаханы».
7.40 Камедыя «Закахацца ў нявесту брата».
9.20 Камедыя «Каханне жыве тры гады».
10.55 Камедыя «Замёрзлая з Маямі».
12.30 Камедыя «Законы прывабнасці».
14.00, 14.50, 15.30 «Камедыянты (Шоу)».
14.25, 15.15, 0.40, 2.50, 5.35 Скетчком «Паміж намі».
16.00 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
17.20 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
19.00 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 3».
20.20 Камедыя «Алмазны сабака».
22.00 Серыял «Пакетная здзелка». 1-я серыя.
22.45 «Камедыянты. Лепшае».
23.10 Камедыя «Каханне без перасадак».
1.15 Камедыя «Я вельмі ўзбуджаны».
3.10 Серыял «Былыя».
4.00 Камедыя «Гаспадар у доме».

ТБ3

6.00 М/ф.
10.15 «Свая праўда».
11.15 «Хронікі маскоўскага побыту».
12.00 «Гісторыі выратавання».
12.30 «Упасці ў каханне». Дак. фільм.
13.20, 1.30 «Агент». Серыял.
19.50 «Пікап. Здым без правілаў».
21.20 «Пісьмы да Джульеты». Маст. фільм.
23.15 «Пяць гісторый пра каханне». Дак. фільм.
0.00 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

ТБ1000

6.00 Драма «Сапраўдныя каштоўнасці».
8.30, 16.00 Драма «Аўгуст Раш».
10.30 Фантастыка «Паралельныя светы».
12.30 Камедыя «Поўнач у Парыжы».
14.15 Трылер «Тайнае акно».
18.00 Драма «Скарб».
20.00 Драма «Не злоўлены, не злодзей».
22.15 Камедыя «Экзамен для дваіх».
0.15 Камедыя «Настрой індыга».
2.30 Баявік «Машына часу».
4.30 Драма «10 крокаў да поспеху».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Драма «Захоўвай мяне, мой талісман».
7.40 Камедыя «Вось гэта каханне!».
9.20 Меладрама «Жаніх па аб'яве».
11.00 Камедыя «Зімовы сон».
12.50 Трагікамедыя «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца».
14.20 Камедыя «Горка!».
16.00 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
17.30 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
19.00 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 3».
20.20 Камедыя «М+Ж».
22.00 Камедыя «Звычка расставацца».
23.20 Меладрама «Будзь са мной».
0.40 Камедыя «Адно каханне на мільён».
2.40 Драма «Ты ў мяне адна».
4.30 Камедыя «Нерэальнае каханне».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Інжынерныя ідэі.
6.45 Зрабі або памры.
7.30 Паядынак неператможных.
8.15 Гульні розуму.
8.40 Займальная навука.
8.55, 18.00 Навуковыя недарэчнасці.
9.20, 10.25, 12.40, 16.30 Кіраванне натоўпам.
9.40 Космас: Прастора і час.
11.10 Навука будучыні.
11.55 Больш чым фокусы.
13.25 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
14.10 Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
14.55 Ласасёвыя войны.
15.45 Гісторыя жывёльнага свету.
17.15 Гульня ў лікі.
21.00, 0.45, 3.45 Расследаванні авіякатастроф.
22.30, 2.15 Эвакуацыя Зямлі.
23.15, 3.00 Уварванне на Зямлю.
0.00, 5.15 Апакаліпсіс Мая.

DISCOVERY

8.00, 17.10, 5.15 Мотабітва.
8.50, 15.30 Хуткія і гучныя.
9.40, 16.20, 6.05 Мяцежны гараж.
10.30 Брыстольскі заліў.
11.20 Залатая ліхаманка.
13.00, 4.00 Склады: бітва ў Канадзе.
13.50, 22.10 Бітвы за кантэйнеры.
14.40 Бітва за нерухомасць.
18.00 Прапажы на продаж.
23.00 Вастраў з Беарам Грылсам.
23.50 Эфект Карбанара.
0.40 Мяцежнікі ледзянога возера.
1.30 Голыя і напалоханыя.
2.20 Не спрабуйце паўтарыць.
3.10 Хлопцы з Юкана.
4.50 Маланкавыя катастрофы.
7.05 Невытлумачальнае.

■ Кінагід

СТРАШНА ЦІКАВА

Факты пра вядомыя фільмы жахаў, пасля чытання якіх вам, магчыма, захочацца наладзіць кінапрагляд.

Фрэдзі Кругер з'яўляецца адным з самых жудасных зладзеяў у жанры страшнага кіно — ад якога немагчыма збегчы, бо ён хаваецца ў чалавечых снах. Пісьменнік і рэжысёр Уэс Крэйвен назваў яго ў гонар хулігана з уласнага дзяцінства, а вось сам вобраз прыйшоў да аўтара куды больш няпростым шляхам. Аднойчы Крэйвен прачытаў у прэсе шэраг артыкулаў, што апісвалі стан, ад якога паміраюць маладыя людзі і які назвалі сіндромам раптоўнай начной смерці. Вядома, што загінулыя не станавіліся ахвярамі забойства ва ўласных снах. Тым не менш больш падрабязна вывучыць загадкавы стан на сённяшні дзень спецыялісты не могуць.

Класіка жудаснага кіно — фільм **Стэнлі Кубрыка «Ззянне»** — захопліваe і працінае зачараванага гледача паступовым нарастаннем напружання. Вялікі ўклад у стварэнне па-сапраўднаму ўціскальнай атмасферы карціны зрабіла манера рэжысёра даводзіць акцёраў да поўнага адчаю бясконцымі дублямі адных і тых жа сцэн. Тым не менш Кубрык выяўляў незвычайны клопат у дачыненні да самай маладой зоркі свайго фільма — шасцігадовага Дэні Лойда. У выніку малы нават не ведаў, што выконвае ролю ў фільме жахаў.

Не менш знакамітай і страшнай працай Стывена Кінга з'яўляецца раман **«Могілкі хатніх жывёл»**, пераўтвораны ў аднайменны фільм. Па волі абставінаў гатэль «Стэнлі» (падчас знаходжання ў якім Кінгу прыйшла ідэя рамана) на сваёй тэрыторыі ўтрымліваў рэальныя і вельмі жудасныя могілкі хатніх жывёл. Аднак нядаўна гэта месца было перакапана і перафарміравана. Цяпер там знаходзіцца павільён для вяселляў. Уступленне ў шлюб на месцы былых могілак хатніх жывёл побач з населеным прывідамі гатэлем... што ж, гэта даволі адважнае мерапрыемства.

Роля маленькага Дэміена ў фільме **«Омен»** патрабавала ад свайго патэнцыйнага выканаўцы наяўнасці асаблівых здольнасцяў і рысаў, бо іграць трэба было самога Антыхрыста. Пошук юнага акцёра з такімі якасцямі стаў няпростай задачай, але калі рэжысёру Рычарду Донеру трапіўся чатырохгадовы Харві Спенсер Стывенс, ён адразу зразумеў, што патрэбны хлопчык знайшоўся. Пазней Донер прызнаўся, што падчас здымак імкнуўся раззлаваць яго фразамі кшталту: «На што ты глядзіш, казяўка? Я цябе адлуплю!» Вынікам такіх рэплік станавіўся пераканаўча гнеўны і страшнаваты твар Харві.

У даследаванні, праведзеным ва Універсітэце Вэстмінстэра, было ўстаноўлена, што пры напружаным праглядзе фільма жахаў, у адрозненне ад любой млявай камедыі, у арганізме чалавека спальваюцца калорыі. Паводле слоў доктара Рычарда Макензі, які спецыялізуецца на вывучэнні метабалізму клетак, кожны з 10 фільмаў, што былі паказаныя паддоследным, выклікаў павелічэнне частаты сардэчных скарачэнняў. У той час, калі пульс пачашчаецца, кроў пачынае цыркуляваць хутчэй, а ў арганізме выпрацоўваецца хуткадзейны адрэналін. Гэты працэс, які звычайна ўзнікае падчас праяў інтэнсіўнага стрэсу (а ў дадзеным выпадку — страху), выклікае зніжэнне апетыту, павышэнне ўзроўню абмену рэчываў, а таксама спрыяе спальванню калорый. Дарэчы, фільм, пры праглядзе якога ў паддоследных «згарэла» больш за ўсё калорый, — гэта неаднаразова згаданае «Ззянне».

■ Замор'е

КРАСУНІ НЕ ПАДАБАЕЦЦА БЫЦЬ ДРУГОЙ

Пацешны выпадак здарыўся на бразільскім конкурсе прыгажосці Miss Amazonas. Шэйслане Хаяла, якая заняла другое месца, сарвала карону з галавы пераможцы спаборніцтваў Кэрал Таледа адразу пасля ўзнагароджання апошняй.

Інцыдэнт знялі на відэа, ролік быў апублікаваны ў сеціве. На ім відаць, што спачатку Хаяла рабіла выгляд, што рада за больш удачлівую саперніцу: яна абняла Таледа, якая атрымала карону, але адразу ўчапілася ва ўпрыгожванне, сарвала яго з галавы пераможцы і кінула на сцэну. Потым яна пайшла са сцэны, нешта выкрыкваючы і размахваючы рукамі.

Пазней на сваёй старонцы ў Facebook Шэйслане напісала, што не шкадуе аб здарэнні, паколькі гэта — пратэст супраць таго, што тытул быў куплены, а яна спадзявалася на сумленную канкурэнцыю. Арганізатары конкурсу моцна абурыліся, Хаяла, хутчэй за ўсё, будзе пазбаўленая тытула віцэ-міс. Не выключана, што супраць яе будзе пададзены іск за паклёп. Пераможца Кэрал Таледа сказала, што ў яе няма слоў, каб выказаць сваё абурэнне.

Узрушальніца спакою Шэйслане Хаяла нарадзілася ў сям'і выхадцаў з Лівана. Ліванская абшчына ў Бразіліі вельмі шматлікая і, па розных звестках, налічвае ад 150 000 да 200 000 чалавек. У 2014 годзе Хаяла прадстаўляла Бразілію на конкурсе Miss Globe International, які праходзіў у Баку, дзе яна таксама заняла другое месца.

СТВАРАЛЬНІКА «ВІЯГРЫ» ПАСВЯЦІЛІ Ў РЫЦАРЫ

Вучонага Саймана Кэмпбэла ўзнагародзілі за заслугі перад навукай прысвячэннем у рыцары Брытанскай імперыі. «Віяграй», якую стварыў брытанец, стала самым прадаваемым рэцэптурным лякарствам.

Усім вядомы медыцынскі прэпарат паступіў у продаж у 1998 годзе і адразу атрымаў прызнанне грамадскасці. Попыт на гэтыя лекі сярод насельніцтва быў проста ашаламляльны. Паводле статыстычных звестках, з тых часоў па ўсім свеце было прададзена больш за адзін мільярд таблетак.

У сувязі з гэтым вучоны Сайман Кэмпбэл, які ўдзельнічаў у стварэнні «Віяграй», атрымаў ганаровае званне рыцара Брытанскай імперыі. Падчас распрацоўкі прэпарата Кэмпбэл з'яўляўся супрацоўнікам кампаніі Pfizer. Яму 73 гады, ён таксама ўдзельнічаў у распрацоўцы лекаў пад назвай «Кардура», якія выкарыстоўваліся для барацьбы з павышаным ціскам і ангінай, і «Нарваск», што змагаецца з павышаным ціскам і павелічэннем прастаты. Разам з «Віяграй» гэтыя прэпараты лічацца аднымі з самых прадаваемых рэцэптурных лекаў у свеце. Акрамя практычных распрацовак, спецыяліст у галіне фармацэўтыкі займаўся тэарэтычнай навуковай дзейнасцю. Кэмпбэл з'яўляецца аўтарам звыш 110 патэнтаў і публікацый на гэтую тэму.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС

НЯДЗЕЛЯ, 15 ЛЮТАГА

БЕЛАРУСЬ 1

7.20 Меладрама «Нявеста».
8.50 Слова Мітрапаліта Паўла на свята Стрэчання Гасподняга.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
9.40 XXL WOMAN TV.
10.15, 0.05 Серыял «Крыху не ў сабе».
11.20 «Пра ежу!».
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 «Зона Х». Вынікі тыдня.
13.00 Тайны следства.
13.35 Каробка перадач.
14.10 «Terra incognita». Беларусь невядомая.
14.45 Нашы.
15.10 Твой горад.
15.30 Вакол планеты.
16.15 «Вялікі рэпартаж».
16.45 «Трыумф. Героям спорту 2014». Дзённік.
17.05 Выйсце ёсць.
17.35 Драма «Ціхая застава».
19.15 Меладрама «Дуэль».
21.00 Галоўны эфір.
21.55 Навіны надвор'я.
22.15 Меладрама «Я яго зляпіла».

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Камедыя «З 13 у 30».
8.35 Вышэй за дах.
9.10 М/с «Аватар. Легенда пра Аанга». Заключныя серыі.
10.00, 20.25 Тэлебарометр.
10.05 «Fitnews».
10.40 «Зразумець і абясшкодзіць».
11.15 Камедыя «50 першых пацалункаў».
13.00 «Разбуральнікі міфаў».
14.10 Біятлон. Этап Кубка свету. Эстафета. Жанчыны.
15.40 Я хачу гэта ўбачыць.
16.25 Біятлон. Этап Кубка свету. Эстафета. Мужчыны.
17.55 «Comedy Батл». Без межаў».
19.15 Суперлато.
20.05 Кіпень.
21.00 Спортлато 5 з 36.
21.05 КЕНО.
21.30 Баявік «Гадзіла».
23.45 Ток-шоу «Перазагрузка».
0.30 Баявік «Музыкант».

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 13.30, 18.45 «Размовы пра духоўнае».
8.10 «Скарлет». Меладрама.
11.00 «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Мацвей Мантвалінскі.
11.40 «Наперад у мінулае».
12.05, 18.05 «Размаўляем па-беларуску».
12.10 Хіт парад. «Сто песень для Беларусі».
13.05 «Рэчавы доказ». Мы былі. Дак. фільм.
13.40 «Калі змоўкла сегідылья». Дак. фільм.
14.35 «Зорку за сцінгер». Дак. фільм.
15.20 «Дэзерцір». Драма.
16.30 «Зусім прапалы». Прыгодніцкі фільм.
18.10, 22.10 «Культпрасвет».
18.55 «Дама з камеліямі». Драма.
20.45 Калыханка.
21.10 У. Ткачэнка. «Сімфонія «Бітлз». Выконвае Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.
22.40 А. Валодзін. «Пяць вечароў». Спектакль.

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 1.55 PRO спорт. Навіны.
8.00 Тэніс. Турнір ВТА. Антверпен. Паўфінал.
10.00 Хакей. КХЛ. «Атлант» (Маскоўская вобл.) — «Дынама» (Мінск).
11.55 Біятлон. Этап Кубка свету. Халменколен. Спрынт. Жанчыны.
13.25 Біятлон. Этап Кубка свету. Халменколен. Спрынт. Мужчыны.
14.55 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Німбурк».
16.45 Тэніс. Турнір ВТА. Антверпен. Фінал.
18.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
18.55 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. ПСЖ (Францыя) — «БГК імя Мяшкова» (Беларусь).
20.35 Біятлон. Этап Кубка свету. Халменколен. Эстафета. Жанчыны.
22.10 Біятлон. Этап Кубка свету. Халменколен. Эстафета. Мужчыны.
23.40 Змяшаныя адзінаборствы. Бітва на Дняпры.

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.45 «Фазэнда».
11.20 «ТБ-таксі».
12.10 «Брэйн-рынг».
13.15 Цырымонія ўручэння народнай прэміі «Залаты грамафон».
16.15 Навіны спорту.
16.20 «Першая сусветная. «Гібель Лузітаніі».
17.10 «Кропка ў кропку!».
20.00 Контуры.
21.05 «Дыханне планеты».
21.40 «Танцуй!».
23.40 «Срэбны мядзведзь-2012» Берлінскага кінафестывалю. «Барбара».
1.30 «Ціхі дом». Вынікі Берлінскага кінафестывалю».

СТБ

6.00 Серыял «Студэнты 2».
7.30 «Скардзіцца дазваляецца».
7.50, 16.50 «Аўтапанарама».
8.20 Маст. фільм «Рамэа і Джульета».
10.20 «Чыстая праца».
11.00 «Вялікае снеданне».
11.40 Маст. фільм «Зайчык».
13.15 «Дарагая перадача».
13.40 «Добры дзень, доктар».
14.10 «Тэрыторыя памылак».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.30 «24 гадзіны».
17.20 «Ваенная тайна».
19.30 «Тыдзень».
20.40 Маст. фільм «Кухар для прэзідэнта».
22.30 «Пякельная кухня-2».
23.50 Маст. фільм «Како Шанель».

МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
6.10 М/ф.
9.05 «Ведаем рускую».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15, 2.05 Маст. фільм «Танцор дыска».
12.50 Серыял «Мёртвы. Жывы. Небяспечны».
16.15, 22.00 Серыял «Загадкавыя забойствы Агаты Крысці».
21.00 «Разам».
0.20 Маст. фільм «Кароль, дама, валет».
4.45 Дак. серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «У свеце жывёл».
7.40 Маст. фільм «Замак на пяску».
11.00, 14.00 Весткі.
11.15 «Сам сабе рэжысёр».
12.10 «Смехапанарама».
12.40 «Ранішняя пошта».
13.20 «Пакой смеху».
14.15 «Хуліа Іглесіяс. Жыццё працягваецца».
15.05 Маст. фільм «З каханымі не расставайцеся».
16.25 Маст. фільм «Начная фіялка».
18.05 «Смяяцца дазваляецца».
20.00 Весткі тыдня.
21.55 Маст. фільм «Масква—Лапушкі».

23.45 «Нядзельны вечар».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.05 Серыял «Гончыя».
6.50, 8.20 Серыял «Груз».
8.00, 10.00, 13.00 Сёння.
8.50 «Медыцынскія тайны».
9.25 «Ядзім дома».
10.20 «Першая перадача».
11.05 «Цуд тэхнікі».
11.50 «Дачны адказ».
13.25 Серыял «Дазнаўца».
15.55 Дэтэктыў «Мядзведжая хватка».
17.35 «Выратавальнікі».
18.00 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
19.00 «Сёння. Выніковая праграма».
20.00 Маст. фільм «Кома».
23.30 «Спіс Норкіна».

8 КАНАЛ

9.00, 14.05, 18.50, 20.55, 23.30 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30 Прыгоды «Індзіяна Джонс. Каралеўства хрустальнага чэрапа».
12.30 Драма «Апошні ўрок».
14.10 Драма «Востраў».
16.10 Дак. фільм «Стрэчанне Гасподняе».
16.35 «Сёння клюе».
17.00 «Хатняя крама».
18.00, 23.35 «Хобі TV».
18.55 Прыгоды «Джуманджы».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Драма «Шлях Карліта».

ВТВ

6.00, 5.00 «PLAY».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Вароніны».
10.00, 2.00 «Турба міксер».
12.00 «Паспець за 24 гадзіны».
13.00 «Я падаю на развод».
14.00 «Кіно ў дэталях».
15.00 Серыял «Супер Макс».
16.30 Камедыя «Бобро поржаловать!».
18.45, 23.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
19.00 «Уральскія пельмені».
20.30 Меладрама «Сэрцаедкі».
23.30 «Нерэальная гісторыя».
0.00 «Людзі Хэ».
0.30 «Лаві момант».
1.00 Скетч-шоу «Валера-ТБ».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 Святы. Стрэчанне Гасподняе.
10.35 75 гадоў з дня нараджэння Паўла Лебешава. Маст. фільм «Кін-дза-дза!».
12.40 Дак. фільм «Павел Цімафеевіч Лебешаў. Няскончаная п'еса...».
13.25 Краіна птушак. Дак. фільм «Я бачыў улара».
14.10 «Пешшу...». Масква булгакаўская.
14.40 «Што рабіць?».
15.30 «Венскі бляск». Канцэрт Камернага аркестра «Віртуозы Масквы» пад кіраўніцтвам Пітэра Гута.
16.35 «Хто там...».
17.05 Юбілей Цімура Кібірава. «Лінія жыцця».
18.00 «Кантэкст».
18.40, 1.55 «Шукальнікі». «Тайна гібелі «Ілы Мурамца».
19.25 Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Вайна на ўсіх адна».
19.40 Маст. фільм «Дваццаць дзён без вайны».
21.20 Хрустальны баль «Хрустальнай Турандот» у гонар Марыі Аронавай.
22.40 «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». Ш. Гуно. Опера «Фаўст».
1.50 М/ф для дарослых «Дару табе зорку».
2.40 «Сусветныя скарбы культуры».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 12.00 «У коле сяброў. Вас запрашае Эльдар Разанаў». 1986 год.
7.15 Фільм-канцэрт «Музычны круіз». 1994 год.
7.45 Тэлефільм «Следства вядуць знатакі». 1988 год.
9.00, 3.00 Праграма «Час».
10.00 «Колба часу».
11.00 Праграма «Погляд». 1989 год. 1-я частка.
13.00 «Ранішняя пошта». 1986 год.
13.40 «Вакол смеху». 1981 год.
15.00 «ТБ дыскатэка». 1986 год.
15.50, 21.45 Маст. фільм «Адам жэніцца на Еве».
17.00, 22.55 «Залаты дыск-90». Канцэрт з удзелам В. Дабрыніна. 1991 год.
18.00 «Пакуль усе дома». 1994 год.
18.30 Часопіс «Маскоўскі назіральнік». Сустрэчы на Арбаце». 1992 год год.
19.35 «Музычны клуб-1». Канцэрт. 1991 год.
20.40 Маст. фільм «Сны Ігара Талькова».
0.00 «Клуб падарожнікаў». 1983 год.
1.05 Канцэрт майстроў мастацтваў Азербайджанскай ССР. 1970 год.
1.25 Тэлеспектакль «Мегрэ і чалавек на лаўцы». 1-я частка. 1973 год.
2.35 Фільм-канцэрт «Аркестр Поля Марыа». 1983 год.
4.00 «Народжаныя ў СССР».
5.00 «Песня-87». 4-я частка.

EUROSPORT

3.15, 17.45, 22.45 Скачкі на лыжах з трамплінаў. Кубак свету.
10.30, 13.00, 15.30 Санны спорт. Чэмпіянат свету.
11.30, 16.00 Горныя лыжы.
11.45 Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны.
14.00, 21.15 Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
16.15, 22.00, 2.30 Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
19.45, 23.45 Горныя лыжы. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
1.30 Конны спорт. Ганконг Мастэрс.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.00, 16.15, 3.10 Серыял «Былыя.
6.45 Камедыя «Аб чым маўчаць дзяўчаты».
8.10, 12.20, 14.25, 15.15, 16.00, 16.55, 22.40, 0.40, 2.50, 5.35 Скетчком «Паміж намі».
8.25 Камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета».
10.45 Камедыя «Утаймаванне свавольных».
12.45 Камедыя «Дарагая, мы паменшылі сябе».
14.00, 14.50, 15.30 «Камедыянты (Шоу)».
17.30, 22.00 Серыял «Пакетная здзелка».
18.20 Камедыя «Алмазны сабака».
20.20 Камедыя «Закаханы скнара».
23.10 Прыгоды «Дарога ў Занзібар».
1.15 Камедыя «Круты татчка».
4.00 Камедыя «Я вельмі ўзбуджаны».

ТБ3

6.00 М/ф.
10.00, 5.10 «Свая праўда».
11.00 «Паненка і кулінар».
11.30, 2.10 «Тайны следства». Серыял.
15.00 «Жонка. Гісторыя кахання».
16.15 «Сто пытанняў даросламу».
17.00 «Без падману».
17.50 «Доказ віны».
18.40 «Зоркі і наркотыкі». Дак. фільм.
20.10 «Аляксандр». Маст. фільм.
23.15 «Асцярожна, махляры!».
23.45 «Часова даступны».
0.40 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

ТБ1000

6.00 Трылер «Тайнае акно».
7.45 Баявік «Машына часу».
9.30 Драма «Рэйчал выходзіць замуж».
11.30 Драма «10 крокаў да поспеху».
13.00 Драма «Не злоўлены, не злодзей».
15.30 Камедыя «Настрой індыга».
17.45, 3.45 Драма «Розум і пачуцці».
20.00 Камедыя «Хлопчыкам гэта падабаецца».
21.45 Драма «Лінкальн для адваката».
23.45 Камедыя «Я нармальна супер гуд».
1.30 Драма «Буш».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Трагікамедыя «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца».
8.00 М/ф «Смяшарыкі. Пачатак».
9.40 Драма «Легенда №17».
12.00 Драма «Ты ў мяне адна».
13.50 Драма «Я таксама хачу».
15.10 Камедыя «Нерэальнае каханне».
16.40 Камедыя «М+Ж».
18.20 Драма «Неба паўшых».
20.20 Камедыя «Сябры сяброў».
21.50 Трагікамедыя «Вар'яцкая дапамога».
23.40 Камедыя «Джунглі».

1.10 Драма «Верабей».
2.50 Камедыя «Зімовы сон».
4.40 Меладрама «Восеньскія клопаты».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Інжынерныя ідэі.
6.45 Зрабі або памры.
7.30 Паядынак непераможных.
8.15, 10.25 Гульні розуму.
8.40 Займальная навука.
8.55 Навуковыя недарэчнасці.
9.20, 10.50, 12.40, 16.30 Кіраванне натоўпам.
9.40 Космас: Прастора і час.
11.10 Навука будучыні.
11.55 Картачны фокуснік.
13.25 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
14.10, 22.30, 2.15 Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
14.55 Палярны мядзведзь.
15.45 Гісторыя жывёльнага свету.
17.13 Гульня ў лікі.
18.00 Міжнародны аэрапорт Дубай.
18.45 Расследаванні авіякатастроф.
19.30 Непаражальныя канструкцыі.
20.15 Мегазаводы.
21.00, 0.45, 3.45 Абаронцы культурнай спадчыны.
21.45, 1.30, 4.30 Прызнанні нацыстаў.
0.00, 5.15 Ракавая стыхія.

DISCOVERY

8.00 Склады.
8.50, 2.20 Бітва за нерухомасць.
9.40 Бітвы за кантэйнеры.
10.30, 4.00 Чыгунка Аляскі.
11.20 Хлопцы з Юкана.
12.10 Мяцежнікі ледзянога возера.
13.00 Голыя і напалоханыя.
13.50, 3.10 Гульня на жыццё.
14.40 Востраў з Беарам Грылсам.
15.30, 22.10, 1.30 Хуткія і гучныя.
16.20, 23.00 Эфект Карбанара.
17.10, 23.50 Невытлумачальнае.
18.00, 5.15 Залатая ліхаманка.
0.40 Брыстольскі заліў.
4.50 Маланкавыя катастрофы.

ПАТРАБУЮЦЦА ЖЫВЁЛАВОДЫ...

ШМАТГАДОВЫ БЕСПРАЦОЎНЫ «СТАЖ»

Ужо зранку ў мясцовым аддзеле занятасці ёсць наведвальнікі. Хтосьці ідзе да электроннага табло, каб самому паманіторыць, якія вакансіі ёсць у раёне і колькі там абяцаюць плаціць. Іншыя адразу звяртаюцца да супрацоўнікаў аддзела і з іх дапамогай спрабуюць куды-небудзь уладкавацца.

— Дзяўчаты, за мной будзеце,— аклікае нас нейкі мужчына, калі мы накіроўваемся ў кабінет. Напэўна, вырашыў, што мы таксама па працу.

На прыёме ў спецыяліста сядзіць пажылы мужчына. Крыху нязграбны, у вялікіх акулярах і з амаль сцёртай наколкай на руце. Цэлых шэсць гадоў Фёдар Рыгоравіч афіцыйна лічыўся беспрацоўным. На самай справе, уладкаваўся без афармлення да прыватніка і падзарабляў будаўніцтвам — рабіў рамонты. Да гэтага мужчына на працягу шаснаццаці гадоў тры разы сядзеў у турме. Працоўную кніжку Фёдар Рыгоравіч згубіў. Не ведаю, што паўплывала — барацьба з дармаедствам ці неабходнасць зарабіць на пенсію, да якой засталося два гады, але неафіцыйны будаўнік вырашыў «выйсці з ценю». Мужчына знайшоў месца ў той жа арганізацыі, дзе некалі працаваў. Будзе аглядчыкам гідратэхнічных збудаванняў за чатыры мільёны ў месяц. Пакуль бяруць на выпрабавальны тэрмін, але, калі не з'явіцца прэтэнзій, абяцаюць уладкаваць на больш доўгі час.

Цікава, што яшчэ не прыняты дэкрэт аб стымуляванні занятасці ўжо нарабіў шуму. Больш людзей пацягнуліся ў раённы аддзел занятасці: у дзень, бывае, прыходзіць да дзесяці чалавек, якія больш за год афіцыйна не працуюць. У асноўным мужчыны, але звяртаюцца і жанчыны, што былі на ўтрыманні. Увогуле, 92 жыхары Пухавіцкага раёна стаяць на ўліку як беспрацоўныя. Каля 40 працэнтаў з іх адносяцца да неабароненых катэгорый: моладзь да 21 года, бацькі ў шматдзетных і няпоўных сем'ях, інваліды, сіроты, асобы, якія вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі. На ўліку стаяць і тыя, хто захацеў павучыцца ці не можа працаваць па стане здароўя. Так, адзін мужчына ўжо трэці год не можа прайсці медкамісію з прычыны павышанага ціску.

ВЁСКА ЧАКАЕ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Сёння ў раёне налічваецца 262 вакансіі, з іх 184 — на вёсцы. Па словах **намесніка начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Пухавіцкага райвыканкама, начальніка аддзела занятасці Івана ПІСАРА,** шмат вакантных месцаў у будаўніцтве і жывёлагадоўлі. Заробкі залежаць ад стану гаспадаркі. Напрыклад, на прадпрыемстве «Дукора-Агра» жывёлаводу плацяць 5 мільёнаў у месяц, аператару машыннага даення — 7. Што прапаноўваюць на комплексах, якія не могуць пахваліцца прыбытковасцю,— пытанне на мільён. А дакладней, на 2–3 мільёны беларускіх рублёў. Менавіта столькі там абяцаюць прэтэндэнтам на пасаду жывёлавода і заатэхніка.

Сярэдняя заработная плата ў раёне за мінулы год — каля пяці з паловай мільёнаў. Аднак знайсці вакансію, дзе прапаноўвалі б такую суму, складана. Чатыры з паловай мільёны (неблагія для раёна грошы) можна атрымліваць, калі ўладкавацца фарміроўшчыкам вырабаў на завод, кіроўцам ці токарам. Прыкладна столькі ж плацяць трактарысту і слесару. На пасаду метадыста ў аддзел адукацыі шукаюць чалавека, які згодзіцца на 2 мільёны 800 тысяч у месяц. З іншага боку, сярод суіскальнікаў ёсць людзі з нізкай кваліфікацыяй (ці ўвогуле без яе), і дзіўна было б абяцаць ім адразу вялікія заробкі.

— У пачатку і канцы года заўсёды напружаная сітуацыя з вакансіямі, таму што прадпрыемствы фарміруюць штатны расклад,— тлумачыць г**алоўны спецыяліст аддзела занятасці Людміла АЗЕРСКАЯ.**— Да таго ж у сувязі з аптымізацыяй у многіх арганізацыях ідзе скарачэнне супрацоўнікаў.

Жаночых вакансій у Пухавіцкім раёне сёння практычна няма. Зразумела, чаму дзяўчаты перабіраюцца ў буйныя гарады: не па багатага мужа, як любяць жартаваць (хоць і такі варыянт бывае), а па магчымасць выбраць працу на свой густ. А некаторым жыхарам, напрыклад, з вёскі Чырвоны Кастрычнік, складана знайсці працу праз транспартную недаступнасць населенага пункта.

ВУЧЫЦЦА НІКОМУ НЕ ПОЗНА

Моладзь і школьнікі ў аддзел занятасці звяртаюцца рэдка. Калі гадоў 5–6 таму непаўналетніх было на ўліку да ста чалавек, то сёння — адзінкі.

— Па-першае, сёння няма ўсплёску нараджальнасці. А па-другое, аддзелы адукацыі стараюцца ўладкаваць выпускнікоў у сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы, каб яны атрымалі прафесію. Раней можна было пайсці вучнем токара ці слесара на завод. Зараз прадпрыемствам прасцей узяць гатовых спецыялістаў,— каментуе сітуацыю Людміла Рыгораўна.

Павучыцца прапаноўваюць і дарослым. Ахвотных атрымаць спецыяльнасць накіроўваюць за бюджэтныя сродкі на адукацыю, аплачваюць стыпендыю і праезд. Тым, каго не атрымліваецца працаўладкаваць на вакансіі, што ёсць у раёне, могуць выдаць субсідыю на адкрыццё сваёй справы. Сума — 11 бюджэтаў пражытачнага мінімуму (калі чалавек будзе прадпрымальнікам у сельскай мясцовасці — 15). У былым беспрацоўныя, бізнесмены-пачаткоўцы выбіраюць сваёй сферай дзейнасці будаўнічыя, транспартныя, цырульніцкія паслугі. Бываюць і выключэнні. Пару гадоў таму чалавек адвучыўся на печніка. Цяпер ён запатрабаваны спецыяліст: лецішчы шмат хто будуе.

Фота Надзеі БУКАН.

У аддзеле занятасці выдаюць накіраванне на працу, але яно не абавязвае прадпрыемства наняць чалавека.

— Калі ў другой мясцовасці ёсць вакансіі з жыллём, перасяляем сем'і,— расказвае **галоўны спецыяліст аддзела занятасці Вольга КАНЮШАНЕЦ.**— Учора ў Слуцкі раён двое паехалі. Будуць працаваць аператарам машыннага даення і жывёлаводам. Для перасялення выплачваецца сем бюджэтаў пражытачнага мінімуму. Ёсць і такія, што грошы атрымліваюць і прападаюць. Шукаем іх потым разам з пракуратурай.

Скардзіцца на адсутнасць працы, вядома, не выпадае. Нават калі патрэбных вакансій у інфармацыйнай базе няма, супрацоўнікі аддзела занятасці самі тэлефануюць на прадпрыемствы: раптам нейкія месцы з'явяцца ў найбліжэйшы час? Праўда, сядзець і чакаць, што наймальнік сам цябе знойдзе,— не варыянт. Лянота і безыніцыятыўнасць не прыносяць грошай ні ў горадзе, ні ў раёне. Няма вакансій — пачні працаваць на сябе. Прыдарожны сэрвіс, агратурызм, фермерская гаспадарка… Безліч магчымасцяў. Калі сталіца перанасычана цырульнікамі і візажыстамі, то ў невялікіх населеных пунктах іх адзінкі. Памятаю, як знаёмыя вясковыя дзяўчаты з Вілейскага раёна перад выпускным ездзілі «наводзіць марафет» у Маладзечна, бо варыянта бліжэй не знайшлі. Умеламу чалавеку геаграфічныя абставіны не перашкаджаюць зарабляць. Наадварот: ён ведае, як ператварыць іх у свой плюс.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Каментарый да тэмы

Антаніна ЛАЎРОВА, начальнік упраўлення па занятасці насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама:

— У Мінскай вобласці налічваецца 4 тысячы 173 вакансіі, з іх у сельскай мясцовасці — 2 тысячы 388. За мінулы год 279 беспрацоўных атрымалі субсідыі для арганізацыі прадпрымальніцкай і рамесніцкай дзейнасці, аказання паслуг у сферы аграгурызму. На новае месца жыхарства і працы (у асноўным у сельскую мясцовасць) пры фінансавай падтрымцы нашых органаў летась пераселены 70 сем'яў беспрацоўных. Большасць з іх пераехалі ў Уздзенскі, Капыльскі і Дзяржынскі раёны. Што тычыцца праблемы транспартнай даступнасці асобных населеных пунктаў, то яна можа ўзнікнуць паўсюдна, паколькі графікі працы арганізацый не прывязаны да раскладу руху грамадскага транспарту. Ды і транспартныя патокі, каб пазбегнуць стратнасці, арыентаваны на найбольшую колькасць пасажыраў. У кожным выпадку такая праблема вырашаецца індывідуальна. Напрыклад, работнікаў філіяла прадпрыемства «Мінскэнерга» аграфірмы «Лебедзева» (у тым ліку на фермы, што знаходзяцца ў 15 кіламетрах ад Маладзечна) дастаўляюць транспартам гаспадаркі. На працягу дня аўтобус робіць тры рэйсы з горада і назад, час якіх прывязаны да рэжыму працы аграфірмы. А ў Старадарожскім раёне прадпрыемства «Фармэль» штодзень замаўляе аўтобус і збірае работнікаў па маршруце Глуск — Старыя Дарогі. Акрамя таго, арганізацыя аплачвае праязныя квіткі супрацоўнікам з найбліжэйшых вёсак.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Неасабісты суб'ектыў

БІТВА «ЭКСТРАСЭНСАЎ»

Колькі каштуе прыварожанае шчасце?

«ПАТОМНАЯ варажбітка. Зніму сурокі, вярну каханага, настрою ваша жыццё на гармонію ў сям'і, на поспех і прыбытак у справах…» Нарэзаныя кавалачкі з нумарам тэлефона на краі аркуша з гэтай аб'явай, прыклеенай проста на слупе на скрыжаванні дзвюх вуліц у цэнтры горада, калыхаліся на сіверы нядоўга: ужо праз два дні ўсе былі абарваныя ахвотнымі да лёгкага шчасця. Апошні кавалачак з запаветным нумарам ухапіла-такі мая прыяцелька, ад якой падаўся ўпрочкі муж. Што ні гаварыла ёй пра тое, што толькі дарэмна патраціць грошы, жанчына была няўмольная: «Гэта мая апошняя надзея». Засталося толькі паціснуць плячыма, хаця на язык так і круцілася, што не трэба было ездзіць у камандзіроўку ўдваіх з маладым калегам, а пасля яшчэ выкладваць даволі пікантныя фоткі з той паездкі на старонцы ў сацыяльнай сетцы. Сядзеў бы і сёння яе Юрка дома і сёрбаў бы свой любімы боршч. А цяпер нават самая сапраўдная варажбітка, хай сабе і ў дзясятым калене, ёй наўрад ці дапаможа, калі пакрыўджаны раўнівы муж сам не вырашыць, што трэба дараваць…

Карацей, ужо праз два дні сяброўка захоплена расказвала пра свой паход за прыварожаным шчасцем. «Ты не ўяўляеш: усё прама як у «Бітве экстрасэнсаў»!» — дзялілася ўражаннямі прыхільніца гэтага тэлевізійнага шоу. Яшчэ доўга давялося слухаць і пра незвычайны макіяж, і пра магічнае адзенне і містычныя ўпрыгажэнні варажбіткі, і пра чорныя і чырвоныя свечкі, што гарэлі на яе стале ў таямнічым паўзмроку, і пра нерэальна вялізнага чорнага ката, што бліскаў вачыма на шафе, пра таямнічыя маніпуляцыі, якія яна рабіла над фотаздымкам пакрыўджанага Юркі і якія абавязкова павінны былі ў найбліжэйшыя сем дзён вярнуць блуднага сужэнца ў сям'ю. «Ну, і колькі ты заплаціла?» — удалося, нарэшце, уставіць пытанне, якое цікавіла больш за ўсё. «Ат, усяго сто еўра — звычайная такса за вяртанне каханага. Але ж эфект гарантаваны!» — натхнёна гаварыла прыяцелька.

Было гэта летась на пачатку кастрычніка. Юрка ў сям'ю так і не вярнуўся, а нядаўна мы даведаліся, што ён усё праз тое ж сеціва знайшоў сваё першае школьнае каханне (жанчына таксама была ў разводзе), пачаў з ёй сустракацца, а пасля і ўвогуле пераехаў да яе жыць. «Трэба было на тыя сто еўра заказаць вячэру ў добрым рэстаране, запрасіць туды мужа, патлумачыць, што адбылося непаразуменне, папрасіць прабачэння, замест таго, каб глупствам займацца…» Прызнацца, сваю прыяцельку я больш за ўсё люблю за самаіронію і ўменне пасмяяцца з самой сябе.

Гісторыя гэта сапраўды трохі камічная і ў нейкім сэнсе павучальная. І тое, што ёсць падобныя «патомныя варажбіткі», гатовыя стварыць «шчасце на халяву»,— дык гэта толькі таму, што на падобныя паслугі ёсць попыт. Замест таго, каб задумацца, з якой прычыны каханы сышоў, чаму «ўсе любяць — ніхто замуж не бярэ» або дваццаты год сядзіш на адным працоўным месцы, а павышэння ў наступныя дваццаць гадоў не прадбачыцца (а гэтыя прычыны часцей за ўсё ў нас саміх), мы, заціснуўшы ў жмені немалыя купюры, нясём іх тым, хто абяцае нашыя праблемы вырашыць за нас. Што ж, тады так нам і трэба і няма чаго лямантаваць, што нас падманулі, а тым, хто падманвае, яшчэ і падзякаваць варта. За тое, што даюць зразумець вельмі важнае: акрамя нас саміх, ніякія замовы і рытуалы не дапамогуць захаваць тое, што маеш, і здабыць тое, што хочаш…

АЛЕ ёсць сярод прадстаўнікоў гэтага надзвычай папулярнага сёння бізнесу самая беспрынцыпная катэгорыя — тыя, хто нажываецца на чалавечай распачы, на апошняй надзеі. Яны былі, напэўна, заўсёды, з імі давялося асабіста пазнаёміцца акурат трыццаць гадоў назад, калі з мамай ехалі ў Бараўляны, дзе згараў ад невылечнай тады хваробы бацька. «Бачу, дарагая, бяда ў цябе вялікая, блізкі чалавек цяжка хворы»,— спагадлівым голасам зацягнула чарнявая кабета ў пуховай хустцы… Маці, здаецца, не паспела зразумець, што адбываецца, а ўжо выцягвала з сумкі кашалёк, бо «цаліцелька», адвёўшы ўбок, горача шаптала, што муж цяжка захварэў праз наведзеную псоту і ніякія ўрачы не дапамогуць, калі яе не зняць, а яна гэта можа, вось толькі трэба аддаць усё каштоўнае, што ёсць… На наша шчасце, міма ішоў міліцыянер — і «лекарку» як ветрам здула. Ён злосна цыкнуў на маму, а тая яшчэ доўга сама сабе апраўдвалася: як жа так, яна ж усё ўгадала! А што было ўгадваць пра жанчыну з ценем раптоўнай бяды на твары на прыпынку бараўлянскага аўтобуса, якая трымала за руку перапалоханае дзіця? Што было ўгадваць: хваробу блізкага і гатоўнасць аддаць усё, што мае, каб гэтаму блізкаму стала лягчэй хоць на каліва? Ды тут не тое што экстрасэнсам, нават псіхолагам дыпламаваным быць зусім не абавязкова…

А праз шмат гадоў мы ўсёй нашай вялікай журналісцкай кампаніяй збіралі грошы, каб выратаваць маму нашай сяброўкі. У саракавасьмігадовай жанчыны была неаперабельная злаякасная пухліна: яна згарала на вачах, і адзіная надзея была — на «патомную варажбітку», якая, казалі людзі, рабіла дзівосы. Чарга ў яе дыхтоўны дом пад Мінскам стаяла штодня з раніцы, нягледзячы на немалы «ўстаноўлены тарыф» (мы тады Марыне на візіт сабралі штосьці каля васьмісот долараў). Грошы гэтыя перакачавалі ў кішэню варажбіткі, сяброўку тая запэўніла, што раптоўная хвароба маці «зробленая» нядобразычліўцамі і зайздроснікамі, але яна ўсё «адрабіла» і цяпер няшчасная абавязкова пойдзе на папраўку… Праз паўтара месяца мы зноў збіралі Марыне грошы — на пахаванне мамы…

НЕСУМНЕННА, людзі, якім дадзеныя звышнатуральныя здольнасці словам і пэўнымі дзеяннямі лячыць і выпраўляць жыццёвыя сітуацыі, ёсць. Тыя ж нашы бабулі-шаптухі, з якімі і па жыцці, і па рабоце пашчасціла знаёміцца не аднойчы. Але ні адна з іх не выстаўляла за дапамогу «тарыф»: дасі што (ці капейчыну, ці гасцінец) — падзякуе, не дасі — ні слова не скажа. У іх сціплых вясковых хатах ніколі не было магічнага «антуражу» — хіба што ў сенцах дзівосна пахла зёлкамі — а самі яны былі і застаюцца звычайнымі вясковымі бабулямі без усялякіх там пер'яў, вялізных завушніц у выглядзе чарапоў, магічных «вачэй» ды камянёў, без кідкай рэкламы ў газетах ці на слупах.

Але бітву за нашы кашалькі (а можа, і за душы?) вядуць сёння іншыя «экстрасэнсы», якіх развялося, бы грыбоў пасля дажджу. І аб'явы кшталту «Удзельнік адбору на праграму «Бітва экстрасэнсаў» вылечыць усе немачы і ўладкуе вечнае шчасце і каханне» ніколі не застаюцца без увагі, і паперкі з тэлефонамі «магаў» заўжды абарваныя. Хаця, калі ўключыць разам з тэлевізарам мазгі, можна зразумець, што нават фіналісты таго славутага шоў, безумоўна, людзі з пэўнымі здольнасцямі, і тыя нярэдка памыляюцца. А ўжо проста «ўдзельнікі адбору» ў большасці сваёй — вар'яцкі дом на прагулцы. У каго ж тады спрабуем «купіць» шчасце і здароўе?

СТАЛЫЯ чытачы «Звязды», пэўна, помняць гэту гісторыю. Як наша маладая журналістка пайшла па падобнай аб'яве да «патомнай варажбіткі» з фота, на якім яна была з вядомым бразільскім футбалістам Раналда (дзяўчыне пашчасціла сфатаграфавацца з ім падчас матча яго клуба ў Кіеве). «Варажбітцы» наша Вольга напляла, што гэта яе кавалер — сын афрыканца і беларускі, працуе на заводзе. Яны пасварыліся, і яна гатова заплаціць, каб вярнуць каханага. «Чараўніца» без ценю сумнення ўзяла абазначаную суму, пашаптала на ваду, павадзіла рукамі над фота і ўпэўнена сказала: «Усё ў вас будзе добра, вы пажэніцеся, у вас будзе трое дзетак…»

Пра Раналда апошнім часам пішуць вельмі мала, дый пра былую калегу нашу нешта даўно не чуваць… Можа, у іх, і праўда, усё зладзілася?..

Алена ЛЯЎКОВІЧ

ЗАПРАШАЕМ
РАЗМЯСЦІЦЬ РЭКЛАМУ
Ў ГАЗЕЦЕ «ЗВЯЗДА»
Тэл./факс: (8 017) 287 17 79, 292 04 52.
E-mail: reklama@zviazda.by.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-4513 (назначение – здание специализированное иного назначения (диспетчерская), наименование – диспетчерская), площадью 765,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Пучкова, 28. Составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие (145 кв.м)
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000001004715, площадью 0,1343 га, (назначение – земельный участок для обслуживания и эксплуатации здания диспетчерской с асфальтным покрытием и канализационной сетью) по адресу: г. Гродно, ул. Пучкова, 28.
Начальная цена продажи	2 027 029 000 (два миллиарда двадцать семь миллионов двадцать девять тысяч) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	202 702 900 (двести два миллиона семьсот две тысячи девятьсот) белорусских рублей
Продавец	ОАО «Гроднооблавтотранс», Филиал «Грузовой автомобильный парк № 2 г. Гродно», 230001, г. Гродно, ул. Пучкова, 28, 52-42-20
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.
Аукцион состоится 2 марта 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.	

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

